

НЕ АДРЫВАЦЦА АД КАРАНЁЎ

8

ПРАВІЛЫ ГРЫБНІКА

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 ВЕРАСНЯ 2021 г. СЕРАДА № 182 (29551)

## КОРАТКА

• **Беларуская чыгунка вывучыць попыт на начныя перавозкі паміж Мінскам і гарадамі-спадарожнікамі.**

• Спецмерапрыемства «Арсенал» пройдзе ў Мінскай вобласці 4—8 кастрычніка. Будзе актывізавана работа па выяўленні і канфіскацыў у насельніцтва зброі, якая захоўваецца незаконна, боепрыпасаў, выбуховых прылад і выбуховых рэчываў.



• **Пенсіянеры 1 кастрычніка змогуць бясплатна наведаць Мінскі заапарк.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:**

*«Ядзерная і радыяцыйная бяспека — безумоўны прыярытэт для нашай краіны, і мы строга яго прытрымліваемся, развіваючы супрацоўніцтва з нашымі міжнароднымі партнёрамі на прынцыпах адкрытасці і транспарэнтнасці. Будаўніцтва Беларускай АЭС знаходзіцца на завяршальнай стадыі. У чэрвені падпісаны акт прыёмкі першага энергаблока станцыі ў прамысловую эксплуатацыю. Гатоўнасць другога блока БелАЭС — амаль 90 %. Зараз на ім праходзіць гарачая абкатка рэактарнай установкі. Сёлета ў актыўную зону рэактара другога энергаблока загрузяць ядзернае паліва. Такім чынам будзе пакладзены пачатак этапу фізічнага пуску блока. Яго ўвод у прамысловую эксплуатацыю плануецца ў 2022 годзе».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «МЫ ПАВІННЫ ПРЫНЯЦЬ ДАДАТКОВЫЯ МЕРЫ ПА АБАРОНЕ ІНТАРЭСАЎ ШМАТДЗЕТНЫХ СЕМ'ЯЎ»

**Пра гэта Прэзідэнт заявіў падчас нарады з кіраўніцтвам Савета Міністраў, на якую былі запрошаны кіраўнікі эканамічнага і сацыяльнага блокаў органаў дзяржаўнай улады. На сустрэчы абмяркоўваліся сацыяльныя пытанні: падтрымка шматдзетных сем'яў, развіццё пенсіённай сістэмы, будаўніцтва жылля на вёсцы і рэалізацыя маладзёжных ініцыятыў.**



Фота БелТА.

Кіраўніку краіны на нараду прынеслі некалькі праектаў указаў. Па адным з іх прапануецца пашырыць магчымасці датэрміновага выкарыстання сямейнага капіталу: на паляпшэнне жыллёвых умоў, атрыманне адукацыі ва ўстановах вышэйшай адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў, выкананне лячэбных умяшальніцтваў у артапедыі, набыццё тавараў для рэабілітацыі інвалідаў з парушэннем зроку і апорна-рухальнага апарату. Прадставілі Прэзідэнту і праект Указа «Аб добраахвотным страхаванні дадатковай накапляльнай пенсіі», па якім работнікам даецца права выплачваць у ФСАН не 1 % ад заробку, а да 10 %. Прапануецца абавязаць і работадаўца ўносіць супамерныя ўзносам даплаты на накапляльныя пенсіі. Праект Указа «Аб мерах па аказанні дзяржаўнай падтрымкі» распрацаваны для стымулявання будаўніцтва жылля ў сельскай мясцовасці. Па ім прапаноўваецца шэраг ільгот і магчымасцяў для рэалізацыі гэтай задачы.

«Шэраг пытанняў, якія выносяцца на ўзровень кіраўніка дзяржавы, патрабуюць дадатковай інфармацыі і, магчыма, публічнага абмеркавання. Тым больш што яны адчувальныя і для насельніцтва, і для бюджэту. Таму сёння мы разгледзім і прымем рашэнні, знойдзем баланс паміж гэтымі патрэбамі і разнапланавымі інтарэсамі», — сказаў Прэзідэнт.

### Сацыяльны брэнд нашай дзяржавы

Прэзідэнт звяртае ўвагу: нягледзячы на змены ў функцыянаванні эканомікі вельмі важна не дапусціць зніжэння ўзроўню нараджальнасці.

***«Маю прынцыповую пазіцыю вы ведаеце: краіна і нацыя развіваюцца, калі ў сем'ях выхоўваюцца як мінімум трое дзяцей. Шматдзетныя сем'і — наш асноўны дэмаграфічны арыенцір. З іншага боку, гэта цяжкая і адказная праца, і дзяржава робіць усё магчымае, каб шматдзетнасць стала нормай для нашага грамадства»***, — заўважае Аляксандр Лукашэнка.

Таму ў краіне сфарміраваны важкі пакет сацыяльных мер, які ўключае ў сябе дапамогу пры нараджэнні і выхаванні дзяцей, фінансавую дапамогу на жыллё, ільготы ў адукацыі і ахове здароўя, падатковай, пенсіённай і працоўнай сферах.

СТАР. 2

Камунальныя стасункі

# НА ГЭТЫМ ТЫДНІ Ў КВАТЭРАХ ПАВІННА ПАЦЯПЛЕЦЬ



**Школы, дзіцячыя садкі, бальніцы, музеі, бібліятэкі і іншыя сацыяльныя ўстановы па ўсёй краіне пачалі ацяпляць яшчэ ў панядзелак, а сёння абяцаюць пачаць падаграваць і жылыя дамы Беларусі. Пры гэтым у аўторак гомельскія ўлады, напрыклад, ужо завяршылі падключэнне ацяплення сацыяльных аб'ектаў, брэсцкія — толькі распачалі ацяпляльны сезон, а віцебскія — пусцілі цяпло ў кватэры сваіх жыхароў.**

СТАР. 3

Інвестыцыі

# НЕ ДЗЕЛЯ ВЫСЕЧКІ

**Чаму інвестар прыйшоў з дрэваапрацоўчым праектам у Белавежскую пушчу**




**Некалькі гадоў таму ў Свіслацкім раёне пачалася рэалізацыя самага буйнога ў раёне інвестпраекта. Ён будзе запушчаны вясной будучага года, а цяпер вядзецца актыўнае будаўніцтва. Для раёна гэта даволі добры шанц павялічыць прамысловы патэнцыял і ўзровень заработнай платы. Інвестар патлумачыў, чаму быў выбраны раён, дзе знаходзіцца большая частка Белавежскай пушчы. Аказалася, што справа тут зусім не ў лясным рэсурсе.**

СТАР. 9

ISSN 1990 — 763X

21182

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2021 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

# «МЫ ПАВІННЫ ПРЫНЯЦЬ ДАДАТКОВЫЯ МЕРЫ ПА АБАРОНЕ ІНТАРЭСАЎ ШМАТДЗЕТНЫХ СЕМ'ЯЎ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле кіраўніка краіны, у 2020 годзе на гэтыя мэты было выдаткавана 4,7 мільярда рублёў, у гэтым годзе будзе не менш за 5 мільярдаў.

«Мы можам адказна сказаць, што ***падтрымка шматдзетных — гэта сацыяльны брэнд нашай дзяржавы, яе візітка***», — дадае Прэзідэнт.

З 2015 года працуе праграма сямейнага капіталу, якой скарысталася больш за 100 тысяч шматдзетных сем'яў, прыводзіць лічбы кіраўнік краіны.

«Жыццё паказвае: мы абралі правільны шлях. Колькасць шматдзетных сем'яў прырастае. За апошнія 10 гадоў — практычна ў два разы. Сёння ў краіне іх больш за 115 тысяч. Механізм праграмы працуе. Працуе эфектыўна. А значыць, трэба развіваць яго далей», — падкрэслівае Прэзідэнт.

Але ён задае пытанне: наколькі апраўдана і своечасова пашырэнне межаў датэрміновага выкарыстання сямейнага капіталу?

«Калі ласка, бяры грошы на адукацыю, лячэнне. Потым пайшло-паехала... Давайце, на жыллё, на іншае. Для гэтага ў нас ёсць іншыя крыніцы. Потым мы гэтыя грошы зрасходуем. А чалавек 18 гадоў дасягнуў. Трэба паступіць кудысьці ці іншае — грошай няма. Размываць гэтыя грошы не трэба. Няхай чалавек атрымае іх на ўналецце. А для іншых мэт павінны быць іншыя крыніцы, — заўважае Прэзідэнт. — Нельга разменьваць доўгатэрміновую падтрымку на імгненныя патрэбы. Хацеў бы пачуць дадатковыя аргументы распрацоўшчыкаў па гэтым пытанні».

Ён падкрэслівае, што жыллё — самая надзённая патрэба людзей, таму наспела неабходнасць унесці пэўныя карэктывы ў парадак і ўмовы надання дзяржаўнай падтрымкі нашым грамадзянам пры будаўніцтве і набыцці жылых памяшканняў.

«Нават у гэты няпросты момант мы павінны прыняць дадатковыя меры па абароне інтарэсаў шматдзетных сем'яў і забяспечваць фінансавую дапамогу пры будаўніцтве жылля да дасягнення дзецьмі 23 гадоў. Раней было да 18 гадоў. Таксама плануецца павялічыць памер дзяржаўнай падтрымкі тым шматдзетным сем'ям, што жывуць у вёсцы, у якіх хоць бы адзін з сужэнцаў працуе ў сельскай мясцовасці», — канстатуе Прэзідэнт.

Акрамя таго, для стымулявання пераезду грамадзян у сельскую мясцовасць прапануецца даць магчымасць тым, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у абласных цэнтрах і Мінску, пабудаваць жыллё з дзяржпадтрымкай у населеных пунктах з колькасцю да 20 тысяч чалавек.

«У цяперашняй эканамічнай сітуацыі кожны рубель на ўліку. Любая дзяржаўная падтрымка павінна быць абгрунтаванай. Таму хачу пачуць, наколькі пралічаныя дадзеныя прапановы», — сказаў кіраўнік краіны.

## «Аб дастойным даходзе ў старасці трэба клапаціцца загадзя»

Таксама на нарадзе абмеркавалі прапанаваныя ўрадам падыходы да далейшага развіцця пенсіённай сістэмы. Кіраўнік краіны акцэнтуе: пенсіі павышаюцца пры кожнай фінансавай магчымасці, і выдатна разумее, што для большасці пажылых грамадзян гэта асноўная крыніца даходу.

У Беларусі 2,5 мільёна пенсіянераў (з іх прыкладна 510 тысяч працуюць). Пенсіённыя выплаты перавышаюць 15 мільярдаў рублёў і складаюць амаль 30 працэнтаў агульных расходаў бюджэту краіны.

«Пытанні аб тым, што пра дастойны даход у старасці трэба клапаціцца загадзя, праз дадатковую добраахвотную пенсіённую праграму, узніміліся на VI Усебеларускім народным сходзе. Прапановы па падыходах да вырашэння гэтай праблемы падрыхтаваныя», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка і папрасіў далажыць, як прапрацаваны дадзеныя падыходы і што спатрэбіцца зрабіць для шырокага ўкаранення такой праграмы ў нашай краіне.

## Рэалізацыі грамадзянскіх і маладзёжных ініцыятыў

Асобна разглядзелі на сустрэчы новы кірунак работы — механізм рэалізацыі грамадзянскіх і маладзёжных ініцыятыў на месцах.

«Такія пытанні перад вамі, перада мной асабліва на сустрэчы са студэнцкімі калектывамі ўзнімаліся. Ідэя добрая, ды і кірункаў такой работы мноства ў грамадстве», — кажа кіраўнік краіны.

Па яго словах, гэта можна арганізаваць удзелам грамадзян у добраўпарадкаванні сваіх гарадоў і мястэчак, у рамонце помнікаў і абеліскаў. Моладзь магла б рэалізаваць праекты, накіраваныя на патрыятычнае, інтэлектуальнае, духоўнае і фізічнае выхаванні.

«Тут павінна быць выбудаваная сістэмная работа на перспектыву. Гэта наш ідэалагічны вектар. Пры гэтым трэба забяспечыць пастаяннае суправаджэнне дадзенай работы на ўзроўні Савета Міністраў, Парламента і асабліва на ўзроўні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Мы павінны абсалютна выразна разумець, як будзе кантралявацца іх размеркаванне і выкарыстанне», — мяркуе Прэзідэнт і дадае, што хацеў бы пачуць аргументаваную пазіцыю ўрада па ўсіх абазначаных пытаннях.

Як заявіў кіраўнік краіны, за выкананнем прынятых на нарадзе рашэнняў патрабуе ўстанавіць кантроль і забяспечыць якаснае і шырокае інфармацыйнае асвятленне гэтых тэм.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму

Першы дакладчык па пытаннях нарады, як звычайна — профільны міністр. Гэтым разам — **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ**, якая расказала пра магчымасці датэрміновага выкарыстання сямейнага капіталу і ўкараненне сістэмы дадатковых пенсіённых накапленняў. Пасля ўжо ў размове з журналістамі міністр удакладніла, якія меры праектаў указаў знайшлі падтрымку, а якія будуць дапрацоўвацца.

**Куды магчыма ўкласці грошы сямейнага капіталу?**

Па яе словах, сёння амаль 40 тысяч дэпазітных рахункаў сямейнага капіталу пайшлі на датэрміновае выкарыстанне. Усяго з 2015 года іх было адкрыта 104 тысячы.

«Сёння тры галоўныя кірункі, на якія з 2020 года можна выкарыстоўваць сямейны капітал, — жыллё, адукацыя і ахова здароўя. Большасць з дэпазітаў пайшлі на датэрміновае выкарыстанне з 2020-га на жыллё. Сустракаючыся са шматдзетнымі сем'ямі ў рамках дыялогавых пляцовак, мы пачулі, што ёсць шмат жыццёвых сітуацый, па якіх сем'і папрасілі пашырыць магчымасці», — сказала Ірына Касцевіч.

Так, у першую чаргу сродкі неабходныя для пагашэння пазык, выдадзеных арганізацыямі, дзе працуюць шматдзетныя бацькі, для набыцця часткі жылля, выкупу ва ўласнасць памяшкання пры ўмове, што яно будзе цалкам належаць шматдзетнай сям'і.

«У праекце ўказа прадугледжаны і абмежавальныя меры, каб не дапусціць нямэтавае выкарыстанне бюджэтных сродкаў пры набыцці жылля», — дадала міністр.

Прадугледжана магчымасць датэрмінова выдаткоўваць сродкі з капіталу на медыцынскія паслугі ў галіне артапедыі, набыццё сродкаў рэабілітацыі для інвалідаў па зроку і з парушэннямі апорнарухальнага апарату.

Як адзначыла міністр, праект Указа «Аб выкарыстанні сямейнага капіталу» будзе дапрацоўвацца аператыўна і сумесна з органамі мясцовай улады.

**У чым заключаецца сістэма добраахвотных пенсіённых накапленняў?**

Па словах міністра, на пенсіі па звычайнай (салідарнай) сістэме сёлета пойдзе 15 мільярдаў рублёў і дзяржава захоўвае свае гарантыі па пенсіённым забеспячэнні.

«Наша задача, каб кожны грамадзянін спадзяваўся не толькі на дзяржаўную падтрымку ў выглядзе пенсіі па ўзросце, але і быў зацікаўлены ў павышэнні свайго ўзроўню жыцця ў старасці. Таму і прапаноўваецца новы механізм па добраахвотных накапляльным страхаванні», — звяртае ўвагу міністр.

У чым будзе заключацца сістэма? Выплачваючы за свайго заробку да 10 %, работнік будзе фарміраваць накапленне на старасць. Калі чалавек заплаціў з заробку тры і больш працэнты ў накапляльную сістэму, 3 % выплочвае і яго наймальнік.

«Былі пытанні з боку наймальніка: ці павялічваецца на яго нагрузка? Мы адказваем: не. Сёння наймальнік плаціць у пенсіённую сістэму 28 %. Тыя тры працэнты, што пойдуць на чалавека ў пенсіённы фонд, будуць вымацца з 28 %. Такім чынам, у Фонд сацыяльнай абароны пойдзе 25 %. Тры працэнты не трапяць у фонд, але пры гэтым за чалавекам будуць захаваны ўсе пенсіённыя гарантыі», — тлумачыць кіраўнік ведамства.

Журналісты спыталі, наколькі абароненыя грашовыя ўклады на пенсію ад абясцэньвання. Ірына Касцевіч адзначае: рызыкі ёсць, але дзяржслужачыя разлічваюць на цікавасць да сістэмы тых, каму засталося ад 3 да 10 гадоў да пенсіі.

«Плюсы сістэмы таксама і ў тым, што сума добраахвотнай пенсіі будзе перадавацца ў спадчыну і капіталізавацца», — рэзюмавала міністр.

**Як дзяржава стымулюе будаваць жыллё на вёсцы?**

Па праекце Указа «Аб мерах па аказанні дзяржаўнай падтрымкі» дакладваў **кіраўніку краіны міністр архітэктуры і будаўніцтва Руслан ПАРХАМОВІЧ.** Наконт некаторых пунктаў дакумента на нарадзе разгарнуліся вострыя дыскусіі. Таму не ўсе пастулаты, што былі прапанаваны, прынятыя, — указ скарэктуюць і зноў прадставяць на абмеркаванне з Прэзідэнтам.

«Два асноўныя кірункі, што мае ўказ, — стымуляванне будаўніцтва жылля ў сельскай мясцовасці і карэкціроўка ўмоў аказання дзяржпадтрымкі з улікам практыкі, што ўжо напрацавана ўказамі па дзяржпадтрымцы № 240 і № 13», — паведаміў Руслан Пархамовіч.

У праекце дакумента захаваецца пункт аб тым, што грамадзяне з абласных цэнтраў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, набываюць правы першымі будаваць жыллё ў малых населеных пунктах.

«Мы таксама абмяжоўваем магчымасць выдзялення дзяржаўнай падтрымкі ў выпадку, калі грамадзянін, што мае права на такую дзяржпадтрымку, плануе змяніць месца жыхарства. То-бок, пабудаваць жыллё не там, дзе ён пастаўлены на ўлік. Такі грамадзянін зможа пабудаваць жыллё толькі ў меншых населеных пунктах, — дадае міністр. — На наш погляд, гэта мера абмяжуе адток сельскага насельніцтва з месцаў пражывання».

Таксама, праект указа прадугледжвае магчымасць дакрэдытавання, калі адзін з крэдытаатрымальнікаў памёр і не змог у поўным аб'ёме рэалізаваць свае магчымасці на атрыманне крэдыту.

**Якія маладзёжныя ініцыятывы будуць падтрыманы дзяржавай?**

На гэтае пытанне пасля нарады адказаў **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.** Ён адзначыў, што работа над адпаведнымі прававымі нормамі будзе працягнута, але сама ідэя Прэзідэнтам падтрымана.

«Сёння Міністэрства адукацыі вядзе праграму «Адукацыя і маладзёжная палітыка». У нас закладваюцца пэўныя сродкі на правядзенне розных цэнтралізаваных мерапрыемстваў. У тым ліку з удзелам маладзёжных аб'яднанняў. Тут зараз стаіць пытанне аб стварэнні своеасаблівага фонду, у тым ліку і са спонсарскіх сродкаў, што могуць накіроўвацца на падтрымку малых маладзёжных ініцыятыў», — сказаў міністр.

Сярод такіх праектаў ён назваў студэнцкія атрады, аздараўленчыя праекты.

«Вельмі важныя сёння пытанні патрыятычнага выхавання моладзі — тут могуць быць разнастайныя ініцыятывы па ўвекавечванні памяці герояў вайны», — адзначыў Ігар Карпенка.

---

Ва ўрадзе

# Рэальныя даходы і ВУП вырастуць

## Бюджэт наступнага года абмеркавалі падчас пасяджэння Савета Міністраў

**«Бюджэт захавае сваю сацыяльную накіраванасць. У наступным годзе значна вырастуць выдаткі на аплату працы ў бюджэтным сектары, выплату пенсій ваеннаслужачым, падтрымку шматдзетных сем'яў і іншае. Акрамя таго, на субсідзіраванне грамадзян па Указе № 240 (льготнае будаўніцтва жылля) прадугледжваюцца сродкі ў аб'ёме Br476 млн, што ў 1,5 раза вышэй за ўзровень гэтага года», — перадае словы прэм'ер-міністра Рамана ГАЛОЎЧАНКІ БелТА.**

Паводле яго, у 2022 годзе мяркуецца, што тэмп росту ВУП складзе 102,9 %, рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва плануюцца на ўзроўні 102 %, інвестыцыі ў асноўны капітал павінны вырасці на 3,3 %, экспарт тавараў і паслуг павінен павялічыцца на 6,3 %.

«Усе найважнейшыя параметры балансуюцца. Галоўнымі фактарамі росту беларускай эканомікі ў 2022 годзе павінны стаць апераджальны рост знешняга попыту, які павінен даць уклад у прырост ВУП у памеры 1,8 працэнтнага пункта, і збалансаванае нарошчванне ўнутранага спажывання без залішняга ціску на фінансавы і валютны рынкі», — дадаў прэм'ер-міністр.

Напярэдадні пасяджэння **міністр фінансаў Юрый СЕЛІВЁРСТАЎ** паведаміў журналістам, што бюджэт 2022 года плануецца з дэфіцытам каля 3 млрд рублёў.

«На жаль, ад дэфіцыту ў бягучай сітуацыі хутка нам не сысці. Але мы думаем, што дэфіцыт бюджэту ў наступным годзе будзе не больш за 1,6 % да ВУП. Гэта прыкладна Br2,9-3 млрд», — сказаў Юрый Селівёрстаў.

Разам

# ПАЛАТЫ ПАВЫШАНАЙ КАМФОРТНАСЦІ — ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ

## У хуткім часе яны з'явяцца па ўсёй краіне

**Учора, у Міжнародны дзень міру, у дзвюх сталічных медустановах былі ўрачыста адкрыты палаты павышанай камфортнасці для ветэранаў войнаў і працы. У мінскім анкалагічным дыспансеры іх 12, у бальніцы хуткай дапамогі — 21. Дапамогу ў іх абсталяванні аказаў Беларускі фонд міру ў рамках акцыі «Наша ўвага ветэранам войнаў і працы». Усяго ў краіне з'явіцца каля дзвюх тысяч такіх палат.**



Фота БелТА.

Палаты аснашчаны як неабходным медыцынскім абсталяваннем — спецыяльнымі ложкамі, пульсаксіметрамі, танометрамі, тэрмометрамі і іншым, так і бытавымі прыборамі, у прыватнасці тэлевізарамі і халадзільнікамі.

— Урачыстае адкрыццё адбываецца ў Дзень міру, і гэта вельмі сімвалічна.Тое, што абрана такая форма ўзаемадзеяння з сістэмай аховы здароўя — дапамога менавіта камфартабельна абсталяванымі палатамі для нашых ветэранаў — нясе яшчэ больш глыбокі сэнс, бо мір на нашу зямлю прынеслі менавіта гэтыя людзі сталага веку, — адзначыў **міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ.** — Кансалідацыя ўсіх намаганняў з'яўляецца сімвалам у тым ліку і гэтага года. Палаты прызначаны для камфартабельнага знаходжання, але маюцца і дыягнастычныя прыборы, неабходныя падчас пандэміі. У такі час для нас важны любы рэсурс і садзейнічанне. Таму мы вельмі ўдзячны калегам, бізнесу, фонду міру.

Акцыя Беларускага фонду міру праводзіцца ва ўсёй краіне — такія ж камфортныя ветэранскія палаты будуць абсталяваны ва ўсіх бальніцах Беларусі. У Мінску іх будзе каля 170, астатнія — ва ўсіх раёнах.

— Нам хочацца, каб нашы бабулі і дзядулі, трапляючы ў складаных сітуацыях у бальніцы, адчувалі сябе камфортна, як дома, — кажа **старшыня праўлення Беларускага фонду міру Максім МІСЬКО.** — Плануем абсталяваць каля дзвюх тысяч ветэранскіх палат павышанай камфортнасці. Мяркую, што за год-паўтара мы гэта зробім. Намаганні ў гэтым кірунку аб'ядналі і дзяржава, і грамадскія арганізацыі, і бізнес. Паколькі мы робім гэта ўсе разам, то ў нас усё хутка атрымліваецца. Прыемна, што акцыя падтрымліваецца ўсімі беларусамі, бо калі людзі збіраюць дабраахвотныя ахвяраванні ў фонд міру, то яны бачаць, куды накіроўваюцца гэтыя сродкі.

Абсталяванне адной палаты абыходзіцца ў чатыры тысячы рублёў, у краіне іх абсталявана ўжо каля 500. Нягледзячы на тое што ўрачыстае адкрыццё толькі адбылося, у некаторых палатах ужо з'явіліся першыя пацыенты. 84-гадовая мінчанка Марыя Афанасьеўна Васілёнак — адна з іх. «Адразу з карабля на баль», — жартуе жанчына і прызнаецца, што не чакала апынуцца ў такіх камфортных умовах.

— Штогод у нашым анкалагічным дыспансеры пралечваецца каля 40 тысяч пацыентаў, сярод іх — вялікая колькасць пажылых людзей, у тым ліку ветэранаў, — адзначае **галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера Віктар КАНДРАТОВІЧ.** — Мы стараемся, каб яны знаходзіліся ў камфортных умовах.

**Алена КРАВЕЦ.**

# НА ГЭТЫМ ТЫДНІ Ў КВАТЭРАХ ПАВІННА ПАЦЯПЛЕЦЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***



Варта адзначыць, што ўсе абазначаныя аб'екты знаходзяцца ў рэжыме праценплівання. Гэта значыць, што хоць батарэі навобмацак будуць здавацца халоднымі, грэцца яны працягнуць (цепланосьбіт у іх будзе меншай тэмпературы). Такім чынам, падключаныя сістэмы ацяплення працуюць, калі сярэднясутачная тэмпература паветра на вуліцы 10 градусаў і вышэй.

Нагадаем, што падстава для пачатку ацяплення ў аб'ектах сацыяльнай сферы — сярэднясутачная тэмпература за акном 10 градусаў і ніжэй на працягу пяці дзён. А для падключэння цяпла ў жыллі сярэднясутачная тэмпература на вуліцы павінна трымацца 8 градусаў і ніжэй на працягу пяці дзён. Апошнімі, як заўжды, пачнуць абаграваць прамысловыя і адміністрацыйныя будынкі.

Рашэнне аб пачатку ацяплення ў раёнах краіны прымаюць мясцовыя ўлады. Усім ім з аблвыканкамаў накіраваны лісты з адпаведнымі рэкамендацыямі. Мяркуючы па прагназаваных у краіне дажджах і максімальнай тэмпературы ў 14 градусаў днём, да канца гэтага тыдня ацяпленне павінна з'явіцца ва ўсіх кватэрах краіны. Вядома, калі не здарыцца пазаштатных сітуацый пры падключэнні.

Нягледзячы на прынятыя рашэнні, пацяплець аднамоманта ва ўсіх не можа, інакш праз рэзка павышаны ў трубах ціск існуе рызыка аварый і парываў. Працэс падключэння цяпла цягнецца некалькі дзён. Каб абагрэць сацыяльныя ўстановы, трэба два-тры дні, для падключэння жылля — да пяці дзён. Жыхарам старога жылфонду, дарэчы, рэкамендуюць звяртаць увагу на «паводзіны» батарэй падчас іх падключэння.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Далучайцеся!

# Менш аўтамабіляў — чысцейшае паветра

## У сераду ў грамадскім транспарце замест праязнога можна прад'явіць тэхпашпарт на машыну

**Еўрапейскі тыдзень мабільнасці праводзіцца з 2002 года. Яго мэта — абраць спосабы перамяшчэння, альтэрнатыўныя асабістаму аўтамабілю, што дазваляе знізіць колькасць забруджвальных рэчываў, якія выкідвае транспарт у атмасферу. Наша краіна таксама далучылася да Еўрапейскага тыдня мабільнасці, у Мінску ён праводзіцца ўжо сёмы год.**

Дзень без аўтамабіля, які адбудзецца 22 верасня, — гэта кульмінацыя Еўрапейскага тыдня мабільнасці ў Беларусі. Дарэчы, у Мінску ў гэты дзень аўтаўладальнікі могуць бясплатна карыстацца грамадскім транспартам, замест праязнога прад'явіўшы тэхпашпарт на машыну.

А наогул на працягу тыдня ў кожным горадзе прайшло шмат розных мерапрыемстваў. У Мінску 16 верасня адбыўся плогінг-забег у раёне вуліцы Ясеніна. Актывісты сумясцілі прабежку са зборам смецця, якое рассартавалі і здалі на перапрацоўку.

У суботу ў парку 60-годдзя Вялікага Кастрычніка адбылося адкрыццё клуба аматараў экатранспарту і фестываль «ВелаЗ'езд». Тут прайшлі інтэрактыўныя гульні, велаквэст, гульня «Што? Дзе? Калі?» па Мэтах устойлівага развіцця, віктарына па Правілах дарожнага руху.

А 22 верасня ў 8 раніцы чакаецца масавы велапрабег, у якім прымуць удзел кіраўнікі і спецыялісты Мінгарвыканкама, раённых адміністрацый сталіцы, арганізацый і ведамстваў. Велапрабег стартуе на вуліцы Усіхсвяцкай, 2, а фінішуе на плошчы Незалежнасці.

Чаму так важна хоць бы на адзін дзень у годзе адмовіцца ад асабістага аўто? Справа ў тым, што ад спальвання адной тоны дызельнага паліва ў залежнасці ад экалагічнага класа аўтамабіля ў атмасфернае паветра паступае 25—125 кг аксіду вугляроду; 20—55 кг вуглевадародаў; 7—35 кг дыяксіду азоту; да 15 кг сажы і іншых забруджвальных рэчываў. Па даных за 2020 год, на душу насельніцтва прыпадае 77 кілаграмаў забруджвальных рэчываў, якія выкідвае транспарт. Няцяжка зразумець, што, чым менш транспарту на вуліцы, тым чысцейшае паветра.

Як паведамілі ў прэс-службе Мінпрыроды, сумарны выкід забруджвальных рэчываў ад мабільных крыніц у 2020 годзе склаў 721 тысячу тон, што на 54,8 тысячы тон, або на 7 %, менш за ўзровень 2019 года і на 79,6 тысячы тон, або 9,9 %, — за ўзровень 2015 года.

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Спроба ваеннага перавароту ў Судане не ўдалася

**Няўдалая спроба дзяржаўнага перавароту здзейснена ў Судане. Пра гэта паведаміў у аўторак тэлеканал Al Arabiya.**



Па даных яго крыніц, путч правалі ўся, «армія і рэгулярныя войскі трымаюць сітуацыю пад кантролем». Паведамляецца таксама, што на вуліцах Хартума з'явіліся танкі, вайскоўцы на нейкі час перакрывалі ўсе масты праз раку Ніл.

Камандаванне УС і кіруючы краінай Суверэнны савет заклікалі народ па дзяржаўным тэлебачанні «стаць на абарону краіны і абараніць пераходны перыяд». Між тым адзначаецца, што ўрад і члены савета працуюць у звычайным рэжыме.

Паводле папярэдняй інфармацыі Al Arabiya, за спробай перавароту стаіць група функцыянераў і прыхільнікаў рэжыму экс-прэзідэнта Амара аль-Башыра, затрымана некалькі афіцэраў бранятанкавых войск. Путчысты, у прыватнасці, спрабавалі захапіць будынак найбуйнейшай радыёстанцыі, аднак не змаглі гэта зрабіць.

### Колькасць ахвяр каранавіруса ў ЗША перавысіла колькасць загінулых ад «іспанкі»

**Колькасць ахвяр пандэміі каранавіруса ў ЗША дасягнула 676 тысяч, што перавышае колькасць загінулых ад эпідэміі так званага іспанскага грыпу ў 1918—1919 гадах. Гэта вынікае з даных універсітэта Джонса Хопкінса, паведамляе ТАСС.**

Згодна з інфармацыяй федэральных цэнтраў па кантролі і прафілактыцы захворванняў ЗША, колькасць ахвяр «іспанкі» склала 675 тысяч. Гэта прыкладная лічба, аднак яна адлюстроўвае маштабы трагедыі. Раней менавіта пандэмія іспанскага грыпу была самай смяротнай у гісторыі ЗША.

Разам з гэтым колькасць ахвяр каранавіруса ў Злучаных Штатах працягвае расці на фоне распаўсюджвання дэльта-штама. Гэта асабліва датычыцца паўднёва-ўсходніх штатаў, дзе мала вакцынаваных. Сярэдняя штодзённая смяротнасць ад інфекцыі за апошні тыдзень складае больш за дзве тысячы чалавек.

### Прэзідэнта Бразіліі прымусілі есці на вуліцы з-за адсутнасці прышчэпкі

**Прэзідэнта Бразіліі Жаіра Балсанару не пусцілі ў нью-ёркскі рэстаран з-за адсутнасці прышчэпкі ад COVID-19. Пра гэта паведаміла агенцтва Reuters.**

Кіраўнік гэтай найбуйнейшай у Паўднёвай Амерыцы дзяржавы прыбыў у ЗША для ўдзелу ў рабоце 76-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Для доступу ў будынак арганізацыі неабавязкова мець пацвярджэнне аб вакцынацыі, аднак у Нью-Ёрку забаронена наведваць месцы грамадскага харчавання без сертыфіката аб імунізацыі.

Раней мэр Нью-Ёрка Біл дэ Блазія заклікаў сусветных лідараў, якія прыязджаюць у горад, прышчапіцца перад візітам. З такой жа заявай выступіў і Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш.

# «ВЫ — ВЕЛЬМІ МОЦНЫЯ ДУШЫ!»

## Аляксей ТАЛАЙ сустрэўся з дзецьмі з Данбаса





Фота Аліны МАЗАВЕЦ

**Кожны мае права на шчаслівае дзяцінства. Дзеці не павінны чуць выбухі, бачыць бліскавіцы баёў, гуляць пад стрэламі. Здавалася б, такія простыя для XXI стагоддзя ісціны. Але, на жаль, для некаторых пакуль нерэальныя. Як гэта — пражыць жыццё і замест светлых шчаслівых дзіцячых успамінаў трымаць у памяці боль і страх вайны? Пакуль такія пытанні актуальныя для дзяцей з Данецкай Народнай Рэспублікі, якія пакутуюць ад рознагалоссяў і праблем дарослых. Аднак некаторыя дарослыя задумваюцца і аб дзіцячых турботах.**

### ЯК ПА НАКАТАНАЙ

На мінулым тыдні 150 дзяцей з Данецкай Народнай Рэспублікі прыехалі ў Беларусь на адпачынак і аздараўленне. Адлегласць больш чым у тысячу кіламетраў яны пераадолелі, каб трапіць у сапраўдную краіну дзяцінства — Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня». Правадніком у гэту краіну для хлопчыкаў і дзяўчынак стаў чалавек, які ведае, што такое боль, — параалімпіец і матывацыйны спікер Аляксей Талай. Разам з супрацоўнікамі свайго Дабрачыннага фонду вясной ён наведаў Данбас, на свае вочы ўбачыў усе наступствы ўзброеных канфліктаў і зразумеў: дзяцей трэба ад гэтага засцерагчы, хоць бы на некалькі тыдняў. А далей усё пайшло як па накатанай — добрыя справы не патрабуюць доўгага прапісанага сцэнарыя. Пра сваю ініцыятыву Аляксей адразу расказаў Прэзідэнту. Аляксандр Лукашэнка прыслухаўся, прыняў да ўвагі і падпісаў адпаведнае распараджэнне. Дабрачынны фонд Аляксея Талая ўзяў на сябе арганізацыйны бок, Міністэрства замежных спраў Расіі дапамагло вырашыць пытанні з дакументамі. Усяляк дапамагала і беларускае Міністэрства адукацыі, Пастаянны камітэт Саюзнай Дзяржавы Беларусі і Расіі. А нераўнадушныя паспрыялі фінансава. Так у дзяцей з Данбаса пачалося падарожжа ў краіну дзяцінства. Ужо па абдымках і ўсмешках на пероне вакзала стала зразумела, наколькі доўгачаканым было гэтае падарожжа.

Праграма адпачынку ў дзяцей распланаваная «ад і да». Спартыўныя, творчыя мерапрыемствы, вучоба, поўны комплекс санаторна-аздараўленчых паслуг, экскурсіі па знакамітых месцах Беларусі... Адзін з самых важных пунктаў праграмы — сустрэча з Аляксеем Талаем — ужо стаў рэальнасцю. Параалімпіец, матывацыйны спікер, бізнесмен, грамадскі дзеяч сустрэўся з гасцямі (якія ўжо адчуваюць сябе тут як дома), падзяліўся з імі сваёй гісторыяй і ад іх шчырасці зарадзіўся сам.

### «КАБ ТАКОЕ НІКОЛІ НЕ ЗДАРЫЛАСЯ»

«Тая трагічная гісторыя ў маім жыцці, калі я стаў (гэтае страшнае слова) інвалідам. Ніхто ж не мог падумаць, што так атрымаецца. Мне здавалася, што гэта ўсё страшны сон. Але як бы я ні маліўся, як бы ні хацеў прачнуцца — не прачынаўся. І вось гэтае пачуцце безвыходнасці, калі разумееш, што нічога нельга вярнуць, было самым цяжкім», — пачаў Аляксей Талай сваю гісторыю. І з першых слоў яго выступлення ў зале стала зусім ціха. Дзеці лавілі кожнае слова свайго куміра, свайго сябра. Такой цішыні ў дзіцячай аўдыторыі пазайздросціў бы кожны настаўнік.

Аляксей расказаў, што падчас рэабілітацыі ў Германіі наведваў розныя храмы. І аднойчы яму сказалі, што ў кожным храме можна загадаць адно жаданне. «Тады я загадваў, каб больш ніколі, ні з кім у свеце не здарылася тое, праз што я прайшоў», — падзяліўся спікер. Пасля хлопчыкі і дзяўчаты расказалі, што ў іх такое ж самае запаветнае жаданне. А Аляксей Талай, як належыць сапраўднаму таварышу, даў ім параду, як зрабіць, каб гэтае жаданне стала рэальнасцю. «Калі б я не знайшоў у сабе сілы прыняць сваю сітуацыю і жыць далей, не было б мяне, заслуг, перамог, фонду, я не мог бы вас сюды запрасіць. Кожная сітуацыя, ваша жыццё залежыць толькі ад вас саміх. Не возьмеце сябе ў рукі, не возьмеце на сябе адказнасць — нічога не атрымаецца. Вучыцеся, развівайцеся, і ўсё будзе добра», — падкрэсліў Аляксей.

Вопытны спікер і чалавек, які ўмее працаваць на публіку, ён прызнаўся, што, выступаючы на гэтай сустрэчы, дасканала падбіраў словы і абдумваў, што казаць. І не ў крыўду Аляксею, наўрад ці ў яго калісьці была настолькі шчырая, адкрытая аўдыторыя, якая лавіла кожнае яго слова. «Вы ўжо столькі ў гэтым жыцці бачылі. Вы вельмі моцныя душы. Вы, дарагія мае, павінны ўсвядоміць, зразумець усю сілу вашага духу, сваю адказнасць. І самае галоўнае — не ўзлавацца, захаваць любоў у сэрцах і перадаць яе дарослым, якія праз свае перажыванні пра яе забыліся», — Аляксей звяртаўся да кожнага прысутнага ў зале паасобку і да ўсіх разам. Псіхолагі і педагогі сцвярджаюць, што, каб данесці нешта да дзяцей, трэба размаўляць з імі шчыра, адкрыта і на роўных. Толькі тады маладыя і своеасаблівыя характары прымаюць тое, што ім кажуць дарослыя, да ўвагі і пачынаюць гэтымі словамі кіравацца. Наколькі гэта атрымалася ў Аляксея Талая на сцэне «Зубраняці», пакажа час. Але ўжо слёзы на вачах і абсалютная зацікаўленасць на тварах дзяцей паказалі, што словы спікера яны прынялі блізка да сэрца.

### ПЫТАННІ — АДКАЗЫ

Самай цікавай часткай сустрэчы сталі пытанні дзяцей да свайго куміра. Прычым пытанні самыя розныя. Яраслаў з горада Макееўка цікавіўся крыніцай натхнення Аляксея Талая. І параду цаніць кожны момант жыцця, развівацца, радавацца кожнай дробязі прыняў як кіраўніцтва да дзеяння. Лідзія з горада Амвросіеўка рашылася задаць пытанне, якое б не агучыў нават самы смелы журналіст. Яна запытала ў Аляксея Талая пра яго самую запаветную мару. «Я ўжо такі шчаслівы чалавек, што баюся мар. І так, здаецца, вельмі шмат увагі. Але ж гэта ўсё мая праца. Я вельмі рады, што ў мяне ёсць дзеці. Чаго я яшчэ магу жадаць? Трэба быць асцярожнымі з марамі», — на шчырае пытанне — шчыры адказ.

Многіх юных удзельнікаў сустрэчы цікавілі больш практычныя пытанні. Напрыклад, чым канкрэтна займаецца фонд Аляксея Талая. Хлопчыкі запыталі пра спартыўны бок жыцця Аляксея, пачатак спартыўнай кар'еры, уражанні ад буйных спаборніцтваў. Акрэдытацыя атлета з Параалімпійскіх гульняў у Токіа выклікала ажыятаж і адправілася ў «падарожжа» з рук у рукі.

Цімура вельмі зацікавіла гісторыя знаёмства Аляксея з жонкай. Хлопец падзяліўся, што часам з дзяўчынкамі бывае цяжка, таму патрэбна парада старэйшага таварыша. Падказку заставацца сабой, не саромецца і быць адкрытым Цімур у найбліжэйшай будучыні праверыць на практыцы.

### АДПАЧЫНАК ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ДАРОСЛЫХ

Ірына Стацэнка, псіхолаг школы-інтэрната № 1 горада Данецка, у Беларусь прыехала разам са сваімі падапечнымі. «За гады сваёй працы ў школе-інтэрнаце я стала сведкай сотняў дзіцячых лёсаў. Дзеці перажылі траўматычныя падзеі на Данбасе — артылерыйскія абстрэлы, вымушанае знаходжанне ў зоне баявых дзеянняў, раненні і страту блізкіх», — расказвае Ірына. Псіхолаг адзначае, што пасля перажытых сітуацый дзеці часта адчуваюць страх, у іх бывае парушэнне сну, узнікаюць цяжкасці ў зносінах з навакольнымі, змяняюцца паводзіны. Нават самае спакойнае дзіця можа стаць гіперактыўным ці замкнуцца ў сабе. У школьнікаў падае паспяховасць з-за зніжэння канцэнтрацыі ўвагі... Па словах спецыяліста, усё гэта — рэакцыі псіхікі на траўматычныя падзеі. Так псіхіка засцерагае сябе ад перагрузак.

«Змена абстаноўкі дапамажа дзецям хоць ненадоўга адцягнуць увагу ад баявых дзеянняў, якія адбываюцца ў родным Данбасе. У гэтым дапамогуць мерапрыемствы, якія ўмацоўваюць іх фізічны і псіхічны стан, развіваюць інтэлектуальны, творчы і спартыўны патэнцыял, станоўча ўплываюць на сацыяльную адаптацыю», — адзначае Ірына Стацэнка. І дадае: нават дарослыя ў «Зубраняці» адчуваюць сябе дзецьмі.

Змена ў «Зубраняці» — не аднаразовая акцыя, гэта толькі пачатак. У планах — запрашэнне на аздараўленне і адпачынак іншых дзяцей. Але на адным энтузіязме, на жаль, нават самыя добрыя справы не робяцца. Таму на сайце Дабрачыннага фонду Аляксея Талая можна зрабіць ахвяраванне на рэабілітацыю дзяцей з Данбаса. Так, па невялікім кроку ад кожнага, будзе зроблена вялікая справа.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

---

Кнігарня

## Беларускія легенды ў кітайскім прачытанні




**Выдавецкі дом «Беларуская навука» накладам у 500 экзэмпляраў выпусціў кнігу «У пошуках папараць-кветкі», дзе пад адной вокладкай сабраны легенды і паданні беларускага народа. Аўтары ідэі, укладальнікі гэтага ўнікальнага творчага праекта — А. І. Лакотка, Т. І. Кухаронак, А. Г. Алфёрава — слынныя беларускія фалькларысты, этнографы, даследчыкі беларускай народнай культуры.**

У легендах адлюстраваны міфапаэтычныя погляды на стварэнне свету, узнікненне геаграфічных назваў і прыродных аб'ектаў. Тэксты, якія падаюцца па-беларуску і ў перакладзе на кітайскую і англійскую мовы, раскладзены на наступныя раздзелы: «Пра паходжанне Сусвету, Зямлі, Чалавека»; «Пра паходжанне плямён, народаў, класаў і розных сацыяльных з'яў»; «Пра Бога, святых, народныя святы і вераванні, страхі»; «Паданні пра гістарычныя падзеі і гістарычных асоб»; «Паданні пра паходжанне назваў гарадоў і мястэчак, урочышчаў, рэк і азёр»; «Пра заклятыя скарбы». Усяго ў зборніку змешчана каля 70 легенд і паданняў, з якіх можна даведацца пра рысы характару беларусаў, пра паходжанне тых ці іншых назваў паселішчаў, рэк і азёр, пра фантастычных звяроў. Па тэкстах можна смела брацца за вывучэнне беларускай народнай культуры.

«Легенды і паданні як адна з разнавіднасцяў няказкавага фальклору складаюць найважнейшую частку беларускага народнага эпасу. У беларускіх легендах знайшлі адлюстраванне рэлігійная ідэалогія грамадства, наіўны і прымітыўны светапогляд нашых далёкіх продкаў, іх уяўленні аб прыродзе, чалавеку, яго працоўнай дзейнасці, духоўных падмурках жыццядзейнасці грамадства. Разам з тым у іх увасоблены шматлікія маральна-этычныя нормы, большасць з якіх арыентавана на агульначалавечыя каштоўнасці», — гаворыцца ва «Уводзінах» да зборніка.

Перакладчыкамі на кітайскую мову выступілі дасведчаныя лінгвісты А. Раманоўская, Ван Цінфэн. Пераклад на англійскую мову належыць Н. Сянкевіч.

Уражвае паліграфічнае выкананне выдання. Кніга аддрукавана на мелаванай паперы ў ААТ «Транстэкс». Да кожнага з твораў, змешчаных у сапраўднай анталогіі паданняў, пададзены выразныя ілюстрацыі — акварэлі, работы, дзе спалучаны розныя тэхнікі: акварэль, туш, аловак, лічбавая графіка... Мастакамі выдання з'яўляюцца Анастасія Стальмашонак, Ігар Сідарэнка, Глеб Сідарэнка, Дар'я Петрусевіч-Кавальчук, Наталля Мураўёва, Юлія Мацура, Аліна Кісляк, Хрысціна Іванцова, Валерыя Гормаш-Дрэбезава, Кірыл Гормаш, Міхаіл Басалыга.

Зборнік «У пошуках папараць-кветкі» — выдатны ўнёсак у фарміраванне беларуска-кітайскага кнігазбору апошніх дзесяцігоддзяў. Варта нагадаць, што шмат для яго пашырэння зроблена рознымі выдавецтвамі нашай краіны — і «Мастацкай літаратурай», і Выдавецкім домам «Звязда», і «Адукацыяй і выхаваннем», і некаторымі іншымі айчыннымі рупліўцамі-кніжнікамі на ніве беларуска-кітайскай дружбы.

**Раман СЭРВАЧ.**

# ПАЛІВА — НАЯЎНАЕ, РАЗЛІК — ДЫСТАНЦЫЙНЫ

## Як развіваюцца тарфяная і газавая гаспадаркі

**Беларусь займае чацвёртае месца ў свеце па здабычы торфу і экспартуе прадукцыю з яго ў 25 краін. Сёлета ў краіне здабыта 1,522 млн тон гэтага рэсурсу. Яго запасаў у 2,4 млрд тон хопіць яшчэ на 100 гадоў, кажуць эксперты. У той жа час у нашай краіне пракладзена звыш 64 тысяч кіламетраў газавых сетак. Усе яны алічбаваны — работу абсталявання можна адсочваць у рэжыме анлайн. Прыродны газ падведзены ва ўсе гарады, райцэнтры і 3,5 тысячы сельскіх населеных пунктаў. Як будуць развівацца газавая і тарфяная гаспадаркі Беларусі ў найбліжэйшую пяцігодку і якімі прыладамі карыстаюцца тут цяпер, журналістам расказалі і паказалі спецыялісты нафтавай галіны.**



Зрэдку неабходна нешта падправіць уручную.

### ТАРФЯНЫЯ ПАЛІ І САБЕКОШТ ГІГАКАЛОРЫІ

У тарфяной сферы распрацавана комплексная праграма мадэрнізацыі тарфяных вытворчасцяў на 2021–2025 гг., у яе межах плануецца здабыць за пяцігодку 11 млн тон торфу, з якіх вырабіць 6,5 млн тон прадукцыі. Асаблівую ўвагу плануюць удзяліць мадэрнізацыі і тэхнічнаму пераўзбраенню, а таксама распрацоўцы тарфяных палёў, якіх у краіне 3,5 тысячы гектараў.

*— За першае паўгоддзе зарабілі для краіны 25 млн долараў: 19 мільёнаў — ад экспарту тавараў (торфапрадукцыі, газавых балонаў, абсталявання, арматуры, прыладаў), 6 мільёнаў — ад экспарту паслуг (у асноўным гэта паслугі па пастаўках звадкаванага вуглевадароднага газу),* — адзначыў важнасць экспартнага патэнцыялу галіны **генеральны дырэктар «Белпалівагаз» Аляксей КУШНАРЭНКА.** — *Тэмп росту экспарту склаў, дарэчы, 122 % да ўзроўню мінулага года.*

Тарфяная галіна мае два стратэгічныя кірункі развіцця. Адзін з іх — **супрацоўніцтва з сістэмамі ЖКГ**. Пяць кацельных Міншчыны ўжо працуюць на торфе. У планах — пераведзці на гэта паліва яшчэ 12 кацельных за пяцігоддзе. Ёсць напрацоўкі з Магілёўскай і Віцебскай абласцямі.

Кацельная ў Стоўбцах магутнасцю 24 МВт, што працуе на торфе, цалкам забяспечвае цяплом мясцовых жыхароў і арганізацыі. Аб'ект прынёс у раён 17 новых рабочых месцаў. Палову сродкаў для арганізацыі яго работы выдзеліла Мінэнерга, палову — сталічны аблвыканкам.

*— Сёлета кацельнай было адпушчана 25 900 Гкал цеплаэнергіі, з якіх амаль 17 тысяч зроблена на торфе. Кацельная камбінаваная, і рэзервовае паліва — газ,* — расказаў **Аляксандр ЦЫВАКА, намеснік старшыні Стаўбцоўскага райвыканкама.** — *Сабекошт гігакалорыі торфу — 77 рублёў, шчапы — 97 рублёў, дроў — 35 рублёў, газу — 124. Дзякуючы таму, што 65 % цяпла адпускаецца на торфе, практычны сабекошт кацельнай — 94 рублі. За паўгода работы мы сэканомілі 627 тысяч бюджэтных рублёў і назапасілі 10,5 тысячы тон торфу. У цэлым сабекошт энергіі ў раёне — 111 рублёў.*

На кацельнай усталяваны два газавыя катлы па 6 МВт і тры катлы па 4 МВт, якія працуюць на торфе. На аб'екце зроблены тры ступені ачысткі, у тым ліку фільтры тонкай ачысткі, якія цалкам фільтруюць цвёрдыя часцічкі, што ўтвараюцца пры спальванні торфу, зольнасць якога, дарэчы, невысокая — 10—15 %. А адходы кацельнай ідуць у справу. Летам раз на тры дні прычэп попелу вывозілі на рэкультывацыю смеццевага палігона.

Ручная праца на кацельнай прымяняецца хіба што падчас ачысткі катлоў. Усё астатняе аўтаматызавана. Аб'ект будаваўся з перспектывай на будучыню. Яго магутнасці хопіць і для 100-кватэрнага дома, які сёлета здаецца ў Стоўбцах, і для школы на 720 месцаў, што нядаўна ўвялі ў эксплуатацыю.

Другі кірунак — **стратэгічнае супрацоўніцтва з цэментнымі кампаніямі**. Усе тры цэментныя заводы краіны выкарыстоўваюць торф — ім пастаўляецца 43 % аб'ёму паліўнага торфу, удакладніў Аляксей Кушнарэнка:

*— Супрацоўніцтва працягвае развівацца. Цяпер прынамсі вядуцца пусканаладачныя работы цеплавога генератара на прадпрыемстве «Краснасельскбудматэрыялы». Гэта дазволіць удвая павялічыць пастаўкі так званай тарфяной сушонкі ў параўнанні з леташнімі аб'ёмамі — да 180 тысяч тон.*

### ТЭЛЕМЕТРЫЯ ГАЗУ І ЦЭНТР АБСЛУГОЎВАННЯ

Згодна з комплекснай праграмай мадэрнізацыі прадпрыемстваў газавай сферы, будзе збудавана каля тысячы кіламетраў газавых сетак, заменяць 900 газарэгулятарных пунктаў, абследуюць на прадмет далейшай эксплуатацыі 40 тысяч кіламетраў газаправода, паведаміў гендырэктар «Белпалівагаз»:

*— Вялікую ўвагу ўдзяляюць дыспетчырызацыі, аптыматызацыі, сістэмам тэлеметрыі, лічбавізацыі. Цяпер укараняецца адзіны аўтаматызаваны мультыпраграмны комплекс, які складаецца з трох узроўняў: базавага, з якім будуць працаваць рабочыя, аператыўна-аналітычнага — для сярэдняга кіруючага саставу, верхняга — які дазволіць як кіраўніку асобнага прадпрыемства, так і ўсёй газавай галіны ў цэлым аналізаваць і кантраляваць усе тэхналагічныя працэсы.*

У рабоце абласных упраўленняў газавай гаспадаркі — два асноўныя кірункі дзейнасці. Гэта работа з грамадзянамі і цэнтры абслугоўвання насельніцтва, якія створаны ў кожным раёне Мінскай вобласці. А таксама работа аварыйна-дыспетчарскай службы ўпраўлення, дзе маецца мноства прылад і тэхнікі, што дапамагаюць прадухіліць ці вырашыць газавыя праблемы, абазначыў **генеральны дырэктар «Мінскаблгаз» Юрый КУКЛІЦКІ**.

Прыродны газ прыйшоў у Стаўбцоўскі раён у 1961 годзе, а ў 1964-м было створана ўпраўленне. У 2015-м яно аб'ядналася з Нясвіжскім і Клецкім раёнам газазабеспячэння, і цяпер на абслугоўванні газавікоў больш за 800 кіламетраў газаправода, расказаў **дырэктар упраўлення «Стаўбцыгаз» Іван ШПІЛЕЎСКІ**:

*— У раёне 323 спажыўцы, з якіх 81 — прамысловы, 242 — камунальныя. 41 210 кватэр газіфікаваны прыродным газам, а 12 800 аснашчаны звадкаваным. У 2019-м базу ўпраўлення рэканструявалі і стварылі тут Цэнтр абслугоўвання насельніцтва. Падчас пандэміі ўстанавілі сістэму бяспекі і абеззаражвання, якая прапускае ўнутр: аўтаматычна правярае наяўнасць маскі і тэмпературы.*

Цяпер у цэнтры больш за 15 тысяч абанентаў, з якіх 133 — прамысловыя спажыўцы. Летась рэалізавалі крыху больш за 45 млн м$^3$ прыроднага газу (больш за палову гэтай колькасці — для насельніцтва). Уласнік жылля можа дыстанцыйна падаць заяву на газіфікацыю свайго дома і прыйдзе да нас ужо толькі для заключэння дагавора на праектна-будаўнічыя і мантажныя работы, а таксама заключэння дагавора на абслугоўванне. А спецыяльнае праграмнае забеспячэнне дазваляе штодня кантраляваць вялікіх спажыўцоў газу (прамыслоўцаў), сьчытваючы інфармацыю пра расход паліва з іх вузлоў уліку, расказала **Вольга ЁДЧЫК, начальнік службы ўліку Цэнтра абслугоўвання насельніцтва**:

*— Асноўныя задачы цэнтра — пастаноўка і рэгістрацыя на ўлік абанентаў, заключэнне і перазаключэнне дагавораў на забеспячэнне прыроднага і звадкаванага газу, прыём наведвальнікаў па прынцыпе «адно акно», інструктаж па бяспечным выкарыстанні газу ў быту, зверка разлікаў за выкарыстаны газ.*

У цэнтры праходзіць акцыя, згодна з якой абанент можа выбраць любую газавую пліту айчыннага вытворцы «Гефест» і набыць яе ў растэрміноўку да паўгода, а атрымаць — праз тры дні. А тыя, хто прыходзіць з дзецьмі, могуць пакінуць іх на час вырашэння пытанняў у дзіцячым кутку.



Фота БелТА.

*— Зарэгістраваны абанент у сваім асабістым кабінеце можа атрымаць кансультацыю па разліках за газ, убачыць, якое абсталяванне ў яго стаіць, калі заключаны дагавор. Ён можа таксама аплаціць паслугі, пакінуць паказчыкі ці заяўку па пытаннях газазабеспячэння. Апошняя аўтаматычна трапіць у нашу сістэму, і спецыялісты звяжуцца з чалавекам,* — патлумачыла прынцып работы Вольга Ёдчык. — *Сёлета ў цэнтр звярнулася крыху больш за 6000 абанентаў. Асноўная частка пытанняў — заключэнне-перазаключэнне дагавораў і замена абсталявання. Мы гатовы таксама прымаць абанентаў, якія будуць прыходзіць ужо з новымі пашпартамі — ID-карткамі.*

### АДС, ПЕРАСОВАЧНАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ І ТРЫВОЖНЫ ЧАМАДАНЧЫК

Мясцовы кабінет аварыйна-дыспетчарскай службы (АДС) рэканструявалі ў 2017-м. Цяпер тут ёсць прамая тэлефонная сувязь (104) з насельніцтвам, радыёсувязь з аварыйнымі брыгадамі і прамая сувязь з МНС, расказаў **Аляксандр БАБІЧ, галоўны інжынер «Стоўбцыгаз»**:

*— На спецыяльным відэаэкране можна ўбачыць розныя праграмныя комплексы, найбольш значныя з якіх панарама, вонкавыя сеткі, пашпарт вузла рэгістравання газу, тэлеметрыя, відэаназіранне за тэрыторыяй філіяла. Тут можна ўбачыць увесь працэс эксплуатацыі аб'ектаў размеркавальнай сістэмы. Даступная інфармацыя пра тэхнічныя характарыстыкі, месцазнаходжанне і параметры работы. Бачны таксама хуткасць і журнал руху газавага аўтатранспарту за любы прамежак часу.*

Дзякуючы сістэме тэлеметрыі можна кантраляваць тэхналагічныя працэсы работы газарэгулятарных пунктаў і шкафных газаразмеркавальных пунктаў. Відаць датчыкі тэмпературы, напружання, ціску. Усе сігналы аб аварыях ці непаладках па канале тэлеметрыі паступаюць у дыспетчарскую АДС.

Такімі сістэмамі, дарэчы, абсталяваны ўсе газавыя гаспадаркі краіны, якія аб'яднаны ў адзіны мультыпраграмны комплекс, а ў змене ў краіне штодня знаходзіцца 150 аварыйных брыгад. За год яны выконваюць 400 тысяч рамонтных і 40 тысяч аварыйных (калі магчымы выхад газу) заявак, падкрэсліў Аляксей Кушнарэнка.

У газавікоў мноства прыбораў і абсталявання. Напрыклад, лазерны дэтэктар, які дазваляе адшукаць уцечку газу на адлегласці ў 30 метраў, або мініпагрузчык (мульчар), абсталяваны прыладамі для ачысткі прасек ад кустоўя. Ён можа пераўтварыць у шчапу драўніну да 150-міліметровага дыяметра. За год такі агрэгат ачышчае 150—180 кіламетраў прасек. А яшчэ ў стаўбцоўскіх газавікоў ёсць адна на ўсю краіну перасовачная лабараторыя, правеў своеасаблівы экскурс па прыладах **Дзяніс ПАМЕЦЬКА, намеснік галоўнага інжынера «Мінскаблгаз»**:

*— На гэтай машыне мы робім паверку манометраў і іншых прылад па ўсіх раёнах Мінскай вобласці. За год павяраецца 9-10 тысяч адзінак абсталявання. А гэтае грузавое аўто аснашчана гідраўлічным інструментам і так званым міні-кранам. Дзякуючы прыладам можна мяняць абсталяванне без адключэння спажыўца ад сістэмы газазабеспячэння дыяметрам ад 50 мм да 300 мм. У трубу ўразаюцца два фітынгі, перакрываецца падача газу, па байпасе газ паступае далей да спажыўца, а ўчастак для работы застаецца без газу, і на ім можна мяняць, скажам, засаўку на шаравы кран. Брыгада на такім аўтамабілі выконвае поўны комплекс работ.*

Сучасныя аўтамабілі газавай службы — гэта своеасаблівыя штабныя пункты, якія могуць прыняць аварыйны выклік наўпрост у аўто. У кожнага слесара ёсць уласны «трывожны чамаданчык», укамплектаваны ўсім неабходным, каб аператыўна справіцца з праблемай і праверыць тэрыторыю на загазаванасць.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

# СТРАШНАЕ СЛОВА

## Для тых, хто прысвойвае сабе права быць «выключнымі»,

**...4 мая 1945 года савецкія войскі пераможным маршам уваходзілі ў Берлін. Горад паў 2 мая, а ў 15:00 капітулявалі рэшткі нямецкага гарнізона. Тое, што ўяўляла сабой зрынутая краіна, Берлін — у дакументах Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, якія сталі даступныя для даследчыкаў не так даўно. Шмат што можна даведацца з «Даклада члена Ваеннага савета 5-й Ударнай арміі генерал-лейтэнанта Бокава члену Ваеннага савета 1-га Беларускага фронту аб стварэнні ваенных камендатур у Берліне і настроях жыхароў горада». Ён датаваны 2 мая 1945 года.**

### НАКАРМІЦЬ І ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПРАЦАЙ

«У горадзе разруха, голад, спыненыя транспарт і прамысловасць», а яшчэ настрой насельніцтва зрынутай Германіі — хтосьці працягваў адчайна супраціўляцца, хтосьці пакідаў пасля сябе выпаленую зямлю, хтосьці рабіў усё, каб больш надзейна схаваць прадукты харчавання, жыццёва неабходныя тавары, каб нічога не дасталася «акупантам», забываючы пры гэтым пра сваіх суграмадзян. У дакументах чытаем: «Пры апытанні жыхары паказваюць, што ўсе каштоўнасці, харчовыя і рэчавыя склады нацысты схавалі ў метро. Абследаванне станцый метро раёна Фрыдрыхсфельдэ цалкам пацвярджае гэтыя паказанні». Ці ж іншае данясенне: «На вуліцах розных раёнаў горада можна бачыць лозунгі: «Берлін будзе нямецкім», «Перамога або Сібір», «Вена зноў будзе нямецкай», «Плюнь у твар таму, хто не можа абараняцца». Настрой жыхароў горада, як і ў цэлым Германіі, не проста насцярожаны. Усе чакалі зверстваў з боку рускіх, распраў ці як мінімум масавай адпраўкі ў Сібір, а ў тым, што будуць высяляць з дамоў, адбірац маёмасць, каштоўнасці, мала хто сумняваўся. Савецкаму ваеннаму кіраўніцтву, у прыватнасці 1-га Беларускага фронту, на фоне перагавораў спачатку аб капітуляцыі, а затым з саюзнікамі па пытаннях далейшага ўладкавання свету трэба было вырашаць і арганізацыйна-гаспадарчыя пытанні, а іх было шмат. І, як ні дзіўна, насуперак прагнозам пра зверствы рускіх у ліку першачарговых яны пачалі вырашаць пытанні аднаўлення нармальнага жыцця для насельніцтва краіны. На фоне жорсткіх загадаў (а Загад за № 1 Начальніка гарнізона і Ваеннага каменданта Берліна генерал-палкоўніка Берзарына і Начальніка штаба гарнізона генерал-маёра Кушава «Аб рэгуляванні палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця горада» быў выдадзены 30 красавіка 1945 года, і 11 пунктаў яго вельмі выразныя, і многія заканчваліся словамі: «па законах ваеннага часу») галоўны ўпор рабіўся на вырашэнне пытанняў мірнага насельніцтва. Напрыклад, пункт 4 абвяшчаў: «Усе камунальныя прадпрыемствы, а менавіта: электрастанцыі, водаправод, каналізацыя, гарадскі транспарт, метро, трамвай, тралейбус; усе лячэбныя ўстановы; усе харчовыя крамы і пякарні — павінны аднавіць сваю работу па абслугоўванні патрэб насельніцтва. Рабочым, служачым пералічаных устаноў заставацца на сваіх месцах і працягваць выкананне сваіх абавязкаў». Пункт 5 — «Службовым асобам дзяржаўных прадуктовых складоў, а таксама прыватным уладальнікам на працягу 24 гадзін з моманту апублікавання гэтага загада зарэгістраваць у ваенных камендатаў раёнаў усе наяўныя запасы харчавання і абыходзіцца з імі толькі з дазволу раённых ваенных камендантаў. Надалей да асобых указанняў выдачу харчавання з прадуктовых магазінаў рабіць па раней існуючых нормах і дакументах...». Жорсткімі былі толькі пункты, якія датычацца фашысцкіх арганізацый. Напрыклад, у п. 2 гаворыцца: «Нацыянал-сацыялістычную нямецкую рабочую партыю і ўсе падпарадкаваныя ёй арганізацыі («Гітлерюгенд», «Фраўэншафт», «Штудэнтэнбунд» і іншыя) распусціць і дзейнасць іх забараніць. Кіруючаму саставу ўсіх



Кіраўніцтва 1-га Беларускага фронту ў першыя дні ў пераможаным Берліне.

установ НСДАП, гестапа, жандармерыі, ахоўных атрадаў, турмаў і ўсіх іншых дзяржаўных устаноў на працягу 48 гадзін з моманту апублікавання гэтага загада з'явіцца ў раённыя і ўчастковыя ваенныя камендатуры для рэгістрацыі. На працягу 72 гадзін на рэгістрацыю абавязаны таксама з'явіцца ўсе ваеннаслужачыя нямецкай арміі, войскаў СС і СА, тыя, што засталіся ў Берліне. Тыя, хто не з'явіцца ў тэрмін, а таксама вінаватыя ў хаванні іх, будуць прыцягнуты да строгай адказнасці па законах ваеннага часу».

У адрозненне ад жорсткасці, зверстваў, якія чынілі фашысты з першых гадзін у дачыненні да мірнага насельніцтва, уступаючы на тэрыторыю СССР, беларускую зямлю, савецкае камандаванне вырашала пытанні аб тым, як накарміць жыхароў Германіі, не дапусціць голаду, аднавіць работу прадпрыемстваў, забяспечыць людзей работай. 11 мая 1945 года з'яўляецца пастанова Ваеннага савета 1-га Беларускага фронту № 063 «Аб забеспячэнні харчаваннем насельніцтва Берліна». Яна аб'ёмная, але нават асобныя яе пункты сведчаць пра тыя крокі, якія рабіла ваеннае кіраўніцтва, каб стабілізаваць сітуацыю, не пагоршыць драму мірнага насельніцтва. «...Выдачу хлеба насельніцтву Берліна здзяйсняць штодня, даўшы права спажыўцам атрымліваць хлеб адразу на два дні: за бягучы дзень і за наступны дзень. Мяса, тлушчы, цукар, крупы і бульбу ў маі г. г. выдаць два разы па ўстаноўленых дзённых нормах». Асаблівая ўвага «дзеячам навукі, тэхнікі, медыцыны, культуры і мастацтва, а таксама кіруючаму саставу гарадскога і раённых органаў самакіравання, кіруючаму саставу буйных прамысловых і транспартных прадпрыемстваў». Звяртае на сябе ўвагу той факт, што прадукты для насельніцтва Берліна, гаручае, транспарт выдзяляліся за кошт лімітаў франтоў, і гэтыя рэсурсы былі немалыя. Напрыклад: «Мукі — 41 000 тон,

**Гітлер пакінуў пасля сябе руіны не толькі ў краінах, якія так імкнуўся заняволіць, але і ва ўласнай краіне. Так, на жаль, адбываецца і ў сучасным свеце, калі дзяржавы, якія прысвоілі сабе права быць выключнымі, навязваюць «дэмакратыю» іншым.**



круп — 5500, мяса — 6500, тлушчаў — 500, солі — 4000» і г. д. Паказваецца і пералік армій, якія павінны былі, што называецца, падзяліцца: «47-я армія. Мукі — 2000 тон, круп — 100 тон; 5-я Ударная армія. Мукі — 2000, круп — 400». Прадпісвалася «прадукты харчавання для забеспячэння насельніцтва Берліна на 7 сутак даставіць па раёнах да 15 мая г. г.». А яшчэ «каменданту Берліна генерал-палкоўніку тав. Берзарыну мабілізаваць на працягу 11—12 мая г. г. 5000 чалавек з насельніцтва Берліна для пагрузкі бульбы; Начальніку АЗГ (аддзел забеспячэння гаручым) фронту палкоўніку тав. Ложкіну адпусціць 1000 тон гаруча-змазачных матэрыялаў для работы аўтатранспарту, пастаўленага на абслугоўванне Берліна, згодна з гэтай пастановай». І такіх пастаноў, распараджэнняў, якія рэгулююць жыццядзейнасць нямецкай сталіцы, нямала. І гэта на фоне голаду і разрухі ў сваёй краіне. На зверствы акупацыйных войскаў, на акупацыю, мяркуючы па дзеяннях так званых «акупантаў», гэта зусім не было падобна.

### АГЛУШАЛЬНАЯ ПРАЎДА

А ў Мінску ў гэты час пачыналіся допыты ваенных нацысцкіх злачынцаў, якіх удалося затрымаць: каго пры вызваленні рэспублікі, каго ўжо за яе межамі або ў беларускіх лясах. Як дзейнічалі фашысты на акупаванай тэрыторыі — таксама ў дакументах. Са «Стэнаграмы судовага працэсу па справе аб злачынствах, учыненых нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Беларускай ССР». Паказанні былога начальніка паліцыі парадку Беларусі генерал-маёра паліцыі і брыгадэнфюрэра СС Эбергарда Герфа: «Калі ў ліпені 1941 года я з паліцэйскім палком «Норд», якім я камандаваў, перайшоў савецка-германскую граніцу, мне было даслана два загады: першы загад... — захопленыя ў палон рускія ваенныя камісары, палітработнікі павінны быць зараз жа знішчаны. У другім... прапаноўвалася паліць вёскі, дазвалялася гвалтаваць жанчын. Сэнс яго зводзіўся да таго, што савецкі народ трэба знішчаць, а маёмасць адпраўляць у Германію». Працэс над ваеннымі нацысцкімі злачынцамі праходзіў у Мінску з 15 да 29 студзеня 1946 года. Шмат каго ўдалося затрымаць: Рыхтэр, камандзір 286-й ахоўнай дывізіі, які адказваў за карныя аперацыі супраць партызан, і арганізаваў лагер смерці ў Азарычах; Вайсіг, камандзір 26-га паліцэйскага палка, які кіраваў чатырма карнымі аперацыямі, у тым ліку ў раёне Глыбокага; Эрмансдорф, камендант Магілёўскага ўмацаванага раёна, які кіраваў зверствамі жандармерыі ў горадзе; Кох, з першых дзён уварвання начальнік асобай каманды гестапа, які знішчаў яўрэйскае насельніцтва і савецкі актыў, пасля начальнік паліцыі бяспекі ў Оршы, Барысаве, Слоніме; іншыя нацысцкія правадыры, якія тварылі бясчынствы. У матэрыялах допытаў — аглушальная праўда пра тое, як абышліся з людзьмі на тэрыторыі рэспублікі. Той жа Кох «курыраваў» душагубкі, асабіста адправіў у Майданэк 700 грамадзян. І ў адказ на пытанне пракурора аб колькасці знішчаных людзей падчас знаходжання ў асобай камандзе, — цынічнае: «Я лічу, што 30 тысяч». І далей: «Я падлічыў прыблізна». Такія адкрыцці на кожным допыце. Яны сведчаць пра добрасумленнае выкананне ўстановак гітлераўскага камандавання аб знішчэнні мірнага насельніцтва рэспублікі. Аналагічныя пацвярджэнні загадзя спланаванага генацыду супраць беларускага народа — у паказаннях фашысцкіх верхаводаў ужо на Нюрнбергскім працэсе.

**За гады акупацыі ў ходзе правядзення гітлераўцамі 140 карных аперацый было цалкам або часткова знішчана 5454 вёскі, створана каля 250 лагераў савецкіх ваеннапалонных і 350 месцаў прымусовага ўтрымання насельніцтва.**

**Гітлераўцы, уварваўшыся ў горад, пачалі арышты жыхароў. Іх загналі на стадыён «Спартак», суткамі трымалі без вады і ежы, гвалтавалі жанчын, метадычна расстрэльвалі мужчын, 200 чалавек паставілі на паўночным баку футбольнага поля і расстралялі з кулямётаў.**

Прыводзім тут толькі адно — начальніка штаба германскай арміі фельдмаршала Вільгельма фон Кейтэля: «13 мая 1941 года Гітлер выдаў загад аб знішчэнні савецкіх людзей. Чалавечыя ахвяры ў акупаваных краінах нічога не вартыя». Герман Герынг, галоўнакамандуючы паветранымі сіламі Германіі, звяртаючыся да войскаў, патрабаваў: «Забівайце кожнага, хто супраць нас, забівайце, забівайце, не вы несяце за гэта адказнасць». А Гімлер любіў дарыць сваім генералам, камандуючым войскамі СС і паліцыі кнігу пра Чынгісхана, загадваючы пры гэтым кіравацца яго метадамі расправы з насельніцтвам, — знішчаць агнём і мячом усё жывое. Перад уварваннем на савецкую тэрыторыю выйшаў аб'ёмны пакет дакументаў пра знішчэнне лішняга, як разлічылі гітлераўскія правадыры з нямецкай педантычнасцю, насельніцтва, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі. Генеральны план «Ост», «Інструкцыя аб асобых абласцях да дырэктывы № 21 плана «Барбароса» ад 13 сакавіка 1941 г., «Аб ваеннай падсуднасці ў раёне «Барбароса» і аб асобых паўнамоцтвах войск» ад 13 мая 41-га, «Дванаццаць запаведзяў паводзін немцаў на ўсходзе і іх абыходжанне з рускімі» ад 1 чэрвеня 41-га і яшчэ цэлы пералік інструкцый і загадаў. Напрыклад, такім ад 17 чэрвеня 41-га Гітлер даваў шырокія правы афіцэрам. Камандзіру было дадзена права прымяняць да мірнага насельніцтва карныя меры барацьбы, накшталт: цалкам спальваць вёскі і гарады, адбіраць у насельніцтва харчаванне і скаціну, па сваім меркаванні зганяць грамадзян на работы ў Германію. Гэты загад быў даведзены да ведама радавога саставу за дзень да нападзення на Савецкі Саюз. Нямецкіх салдат загадзя вызвалялі ад адказнасці за злачынствы ў адносінах да мясцовых жыхароў, а зверствы

# «ГЕНАЦЫД»

## гэта рана ці позна становіцца катастрофай у маштабах народа



Падчас прыняцця капітуляцыі фашыстаў.

ўзводзілі ў ранг дзяржаўнай палітыкі. Практычна ва ўсіх буйных беларускіх гарадах планавалася стварыць пасяленні для прывілеяваных слаёў нямецкага грамадства. Тэрыторыі ж па восі Гродна — Слонім, паўднёвую частку Брэсцкай вобласці, раёны Пінска, Мазыра і астатнюю частку па лініі Пружаны, Парычы, Рэчыца меркавалася ачысціць ад мясцовага насельніцтва і засяліць нямецкімі каланістамі — нямецкай элітай, пакінуўшы толькі частку жыхароў у якасці рабоў.

### «ДЭМАКРАТЫЯ» ПА-ПОЛЬСКУ

Такі план, толькі ў дачыненні да заходніх тэрыторый, клаўся на добрую глебу. Да 1939 года, да ўз'яднання з БССР, тут ужо актыўна праводзілася польскімі ўладамі агрэсіўная паланізацыя, асіміляцыя і акаталічванне беларускага насельніцтва, і не толькі. Шматлікія дакументы, успаміны тых, каму давялося перажыць гэты перыяд, сведчаць, што вялася мэтанакіраваная палітыка ператварэння жыхароў не польскай нацыянальнасці — не толькі беларусаў, але і рускіх, яўрэяў, украінцаў — у людзей другога сорту, то-бок бяспраўных, са стратай іх нацыянальнай ідэнтычнасці. У якасці прыкладу — толькі адзін дакумент: Дакладная запіска Беластоцкага ваяводы пана Асташэўскага на імя Міністра ўнутраных спраў Польшчы ад 23 чэрвеня 1939 года «Праблемы ўмацавання польскага пануючага становішча ў Беластоцкім ваяводстве». Яна пазначана грыфам «Сакрэтная».

**Паранены нямецкай куляй 15-гадовы Саша Свяргун упаў на зямлю, нямецкі салдат пачаў біць яго нагамі і прыкладам, затым фашыст замахнуўся штыком. Маці Сашы кінулася да сына і засланіла яго сваім целам. Азвярэлы фашыст закалоў штыком і маці, і сына».**

Вось толькі некаторыя вытрымкі з запіскі: «Выказваючыся коратка, наша стаўленне да беларусаў можа быць вызначана так: мы жадаем аднаго і настойліва патрабуем, каб гэта нацыянальная меншасць думала па-польску, нічога ўзамен не даваць і нічога не рабіць у іншым кірунку». Паводле польскіх статыстычных даных, да 1938/1939 вучэбнага года ўсе беларускамоўныя школы былі пераведзены на польскую мову.



Што датычыцца вышэйшай адукацыі, то ў 1938/1939 вучэбным годзе ва ўсёй Польшчы налічвалася ўсяго 218 студэнтаў-беларусаў. Сярод навучэнцаў Віленскага ўніверсітэта колькасць беларусаў у 1930—1936 гадах складала 1—2 %, доля палякаў, па даных на 1937/1938 вучэбны год, — 72,6 %. Тых, хто быў не згодны, чакалі жахі канцлагера ў Бярозе-Картузскай, дзе катаванні па сваёй дасканаласці і жорсткасці мала чым адрозніваліся ад тых, якія потым сталі выкарыстоўваць фашысты на акупаваных тэрыторыях. Ды і створаны ён быў для таго, каб «зламаць волю зняволеных, раздушыць людзей псіхалагічна і фізічна». Які быў гэты лагер, што там адбывалася — у дакументах і ўспамінах відавочцаў, у прыватнасці члена Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, ураджэнкі Слонімшчыны В. Г. Іскрык: «У нашай партыі было 90 жанчын, у асноўным камсамольскага ўзросту. Перад варотамі канцлагера ўсіх нас паставілі па двое ў рад і прапусцілі за варотамі да вялікага трохпавярховага будынка скрозь двайны строй паліцаяў з дубінкамі. Кожны паліцай стараўся абавязкова ўдарыць ахвяру, якая праходзіла, дубінкай па галаве альбо па спіне. Асабліва моцным катаванням падвяргаліся тыя, хто ўпаў». Ва ўспамінах відавочцаў — пра тое, як падвешвалі ўніз галавой і залівалі ў рот канцэнтраваны раствор солі, як прымушалі стаяць у такім жа салявым растворы па пояс, іншыя жахі. За пяць гадоў існавання лагера, то-бок, з 1934 года, праз яго засценкі прайшло каля 10 тысяч чалавек — прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў і палітычных поглядаў, проста радавых беларусаў. Гэткае навучанне дэмакратыі па-польску краіны, якая з 38-га ў альянсе з Германіяй, да яе далучаны дзве вобласці Цешэн і Фрайштат, заключаны выгадны гандлёва-крэдытны дагавор. Гэта значыць, генацыд беларускага народа рыхтаваўся задоўга да ўварвання фашыстаў на савецкую тэрыторыю, ахвярамі якога сталі потым і самі палякі. Планы гітлераўцаў у дачыненні да мірнага насельніцтва ўвасабляліся ў жыццё не толькі з асаблівай педантычнасцю, але і з асаблівай жорсткасцю.

### ПАГРОМЫ, КАТАВАННІ, МАСАВЫЯ ЗАБОЙСТВЫ...

Жорсткасць была помстай фашыстаў за супраціўленне. Насуперак распаўсюджанай думцы аб лёгкім узяцці беларускай сталіцы на Мінскім напрамку немцы неслі цяжкія страты. Па паведамленнях Саўінфармбюро, толькі за адзін дзень 27 чэрвеня было «знішчана да 300 танкаў 39-га танкавага корпуса праціўніка». Насмерць стаяла чырванасцяжная дывізія пад камандаваннем генерала Русіянава, шлях перакрывала авіяцыя. Немцы неслі страты ў жывой сіле. Пасля захопу сталіцы ўвесь гнеў абрынуўся на мірных жыхароў. Іх сведчанні, якія пасля ляглі ў аснову даклада Дзяржаўнай камісіі БССР пра зверствы на акупаванай тэрыторыі, уводзяць у стан шоку.

**Нямецкіх салдат загадзя вызвалялі ад адказнасці за злачынствы ў адносінах да мясцовых жыхароў, а зверствы ўзводзілі ў ранг дзяржаўнай палітыкі. Практычна ва ўсіх буйных беларускіх гарадах планавалася стварыць пасяленні для прывілеяваных слаёў нямецкага грамадства.**

За 50 кіламетраў ад Мінска фашыстамі была захоплена група жыхароў, якім удалося выбрацца з палаючага горада. Са сведчанняў Клімук Любові Фёдараўны, якая цудам выжыла у тым пекле. «У лесе нас дагналі 12 аўтамашын з фашысцкімі салдатамі... і пачалі расстрэльваць, ад куль адразу загінула не менш за 50 чалавек, у тым ліку 18 дзяцей. ...Ніколі не забыць жудаснага відовішча: паранены нямецкай куляй 15-гадовы Саша Свяргун упаў на зямлю, нямецкі салдат пачаў біць яго нагамі і прыкладам, затым фашыст замахнуўся штыком. Маці Сашы кінулася да сына і засланіла яго сваім целам. Азвярэлы фашыст закалоў штыком і маці, і сына». Ці яшчэ сведчанні Міхася Караткевіча: «Бежанцаў, перахопленых на дарогах, зганялі ў канцэнтрацыйны лагер каля Мінска. Пяць дзён тысяча зняволеных не атрымлівала ніякай ежы, ... фашысты прывозілі ў дзень адну бочку вады, на ўсіх адна ржавая конаўка. Трупы памерлых ад голаду і збіцця не прыбіраліся па тыднях... Кожны вечар камендант лагера адбіраў па спісах людзей, і раніцай іх расстрэльвалі за двесце метраў ад лагера». Мірнае насельніцтва знішчалі і ў самім горадзе. Пра гэта — паведамленне ў «Мінскай газеце» за 27 ліпеня 41-га. «З прычыны сістэматычных актаў сабатажу з боку грамадзянскага насельніцтва супраць нямецкіх воінскіх уладаў расстраляны 100 чал. мужчын. За кожны акт сабатажу ў далейшым, калі вінаваты акажацца не выяўлены, будзе расстраляна па 50 мужчын. Абавязак кожнага — паведамляць пра вінаватых. Палявы камендант». І ў Мінску пачалося масавае вынішчэнне насельніцтва. У горадзе ўжо ў першыя дні стваралася сетка канцлагераў: лагер смерці на вуліцы Шырокай, каля вёскі Малы Трасцянец, у пасёлку Дразды: Універсітэцкі гарадок ператвораны ў засценкі гестапа і СД; у заходняй частцы створана гета, куды сагналі 100 тысяч яўрэяў. Пагромы, катаванні, масавыя забойствы. Па даных каменданта лагера Рыдлера, да 1.VIII-41 года ў гета ўжо заставалася 85 тысяч чалавек. Што вытваралі немцы ў гета, шырока вядома, але ўсё новыя сведчанні павяргаюць у шок. Напрыклад, памочнік каменданта лагера Готэнбах пад музыку абвяшчаў тосты за знішчэнне яўрэяў, прымушаючы іх спяваць песні, танцаваць, пры гэтым асабіста па чарзе расстрэльваў асуджаных. Гэткая забава ў вольны час. Каб хутчэй пазбавіцца ад лішняга насельніцтва, згодна з планамі гітлераўцаў, арганізоўваліся правакацыі. Адной з такіх стаў выбух у Мінскім драматычным тэатры, пасля якога хапалі і расстрэльвалі без разбору ўсіх, хто трапіцца ім у рукі. Дрэвы ў парках ператвараліся ў шыбеніцы, на вуліцах штодня расстрэльвалі за парушэнне рэжыму. І такая карціна па ўсёй рэспубліцы. Практычна ні адно паведамленне Саўінфармбюро не абыходзілася без расповеду пра зверствы на тэрыторыі Беларусі. У ранішнім паведамленні за 9 жніўня 1941 года быў зачытаны ліст жыхаркі Брэста Пестружыцкай, якая цудам вырвалася з нямецкага палону. У лісце яна апісвала, як гітлераўцы, уварваўшыся ў горад, пачалі арышты жыхароў. Іх загналі на стадыён «Спартак», суткамі трымалі без вады і ежы, гвалтавалі жанчын, метадычна расстрэльвалі мужчын, 200 чалавек паставілі на паўночным баку футбольнага поля і расстралялі з кулямётаў, трупы ніхто не прыбіраў. І страшныя сведчанні з іншых рэгіёнаў: «У вёсцы Кастроўка Крычаўскага раёна немцы ўварваліся ў дом Драгулінай, адабралі прадукты харчавання, калі сталі выводзіць з двара карову, Драгуліна заплакала і паказала на сваіх чацвярых дзяцей. Афіцэр ва ўпор застрэліў яе, прысутнаму аднавяскоўцу Хміру загадаў засыпаць зямлёй дзяцей, кінутых у склеп. Хміра адмовіўся. Закапаўшы дзяцей, гітлераўцы расстралялі Хміру і труп прывязалі да плота». Больш за 250 тысяч дакументальных матэрыялаў пра злачынствы супраць чалавецтва на тэрыторыі БССР было сабрана і прадстаўлена Дзяржаўнай камісіяй рэспублікі ў 1944 годзе ў Надзвычайную дзяржаўную камісію (НДК) па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сведчанні людзей запісваліся, што называецца, па гарачых слядах. Сама камісія была створана 2 лістапада 1942 года ўказам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, яе ўзначаліў сакратар ВЦСПС Мікалай Швернік. Сведчанні ляглі ў аснову агульнага даклада НДК і сталі найважнейшымі доказамі для абвінавачвання на Нюрнбергскім працэсе нацысцкіх злачынцаў.

**Першы загад... — захопленыя ў палон рускія ваенныя камісары, палітработнікі павінны быць зараз жа знішчаны. У другім... прапаноўвалася паліць вёскі, дазвалялася гвалтаваць жанчын.**

За гады акупацыі ў ходзе правядзення гітлераўцамі 140 карных аперацый было цалкам або часткова знішчана 5454 вёскі, створана каля 250 лагераў савецкіх ваеннапалонных і 350 месцаў прымусовага ўтрымання насельніцтва. Толькі ў вёсцы Трасцянец, дзе знаходзіўся адзін з самых вялікіх нацысцкіх лагераў смерці па колькасці знішчаных там людзей, загінула 206 500 чалавек. Прычым, у адрозненне ад Асвенцыма, Майданэка і Трэблінкі, у ім знаходзілася галоўным чынам мясцовае насельніцтва. Акрамя таго, у 186 населеных пунктах рэспублікі былі створаны яўрэйскія гета. Па падліках камісіі, у Беларусі за гады вайны было знішчана 715 тысяч яўрэяў. У перыяд акупацыі ў Германію на прымусовыя работы вывезена каля 400 тысяч чалавек, у тым ліку 24 тысячы дзяцей. Калі даваенная колькасць насельніцтва рэспублікі складала 9,2 млн чалавек, то да канца 1944 яна ледзь дасягала 6 млн чалавек.

Па даных Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў, усяго на тэрыторыі БССР забіта 2 219 316 чалавек грамадзянскага насельніцтва і ваеннапалонных. Гэта афіцыйныя лічбы пасля вызвалення рэспублікі. Нават пры тым, што пасля з'явіліся ўдакладненыя звесткі, прыведзеныя даныя кажуць аб катастрофе, аб незаменных людскіх стратах. А факты генацыду адбываюцца і па гэты дзень... У народзе ёсць павер'е, што ўсё вяртаецца, вяртаюцца да чалавека праблемы, якія ён стварыў калісьці іншым, а для дзяржавы, якая развязала агрэсію супраць іншых народаў, як правіла, усё абарочваецца драмай для свайго ж народа. У маі 1945 года Берлін перажываў сваю драму. Гітлер пакінуў пасля сябе руіны не толькі ў краінах, якія так імкнуўся заняволіць, але і ва ўласнай краіне. Так, на жаль, адбываецца і ў сучасным свеце, калі дзяржавы, якія прысвоілі сабе правы быць выключнымі, навязваюць «дэмакратыю» іншым — агнём і мячом, забываючы, што рана ці позна ўсё гэта можа стаць катастрофай для сваіх жа народаў. Гісторыя нічому не вучыць?

**Наталля ГОЛУБЕВА,**
**кандыдат гістарычных навук.**

Была вайна

# «А ЯШЧЭ АДНЫМ ПОМНІКАМ МОЖА СЛУЖЫЦЬ ВЁСКА...»

**Без ведання гісторыі, яе мінулага немагчыма выхаваць годных маладых людзей. Любоў да сваёй сям'і, да малой і вялікай радзімы прыходзіць да чалавека праз павагу да сваіх каранёў.**
**У гэтым матэрыяле я хачу расказаць пра свайго сваяка Івана Апанасавіча Рудкоўскага, якога людзі ведалі як добрага чалавека і настаўніка, як ваеннага лётчыка, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.**



Аб тым, ШТО давялося перажыць Івану Апанасавічу, мне нагадаў мой дзядзька Васіль Мікалаевіч Грышчанка. Ён успамінаў: «Мы з братам былі малымі, калі неяк у госці да нас прыйшоў дзядзька Іван. Як заўжды, ён прынёс нам гасцінцаў, потым разам з бацькамі сеў за стол. Праз нейкі час размова там зайшла пра вайну. Мы з братам з печы ўсё ўважліва слухалі. Асабліва ж навастрылі вушы тады, калі дзядзька сказаў, што хоча адкрыцца, даверыць нашым бацькам вялікую тайну, пра якую столькі гадоў не казаў нікому, і яны, маўляў, казаць не павінны...

Так і атрымалася, — падсумаваў Васіль Мікалаевіч, — наша сям'я ведала і захаплялася ўчынкам дзядзькі, але распаўсюджвацца пра яго не любіла».

...Калі па парадку, то ўсё выглядала так. Нарадзіўся Іван Апанасавіч Рудкоўскі ў вёсцы Мокрае Быхаўскага раёна 15 мая 1918 года. Да вайны скончыў Макранскую сярэднюю школу, адслужыў у войску. А ў час яе, як многія і старыя, і малыя, пайшоў ваяваць. Прычым рабіў гэта не абы-як: дакладна вядома, што ў 1942-м Іван Апанасавіч быў узнагароджаны медалямі «За абарону Сталінграда» і «За адвагу», у 1943-м — ордэнам Чырвонай Зоркі.

Гэтак жа вядома, што ў гады вайны Іван Апанасавіч быў лётчыкам.

А таямніца, якую свята захоўвала яго радня, заключалася ў тым, што аднойчы ён атрымаў загад разбамбіць... сваю (!) Макранскую школу, на першым паверсе якой знаходзіўся нямецкі штаб, а на другім — шпіталь.

Але было як выканаць той загад, калі школа знаходзіцца ў вёсцы, калі ў выніку бамбёжкі проста непазбежныя і пажар, і ахвяры сярод сваіх...

Цяжка нават уявіць, што перажыў тады лётчык! З аднаго боку, нельга не выканаць загад, а з іншага...

Як скінуць бомбу на вёску, дзе сам нарадзіўся, дзе жывуць бацькі і бабулі-дзядулі, сёстры, браты, цёткі і дзядзькі, землякі, як зруйнаваць школу, дзе сам жа вучыўся...

Выбар у Івана Апанасавіча быў вельмі цяжкі, але ён яго зрабіў: падчас палёту скіраваў штурвал у бок Сарочынскага лесу, скінуў бомбу ў балота. Іншымі словамі, без жалю да сябе вырашыў, што лепей загіне сам, чым загубіць родную вёску, няхай сабе і разам з ворагам...

Шукаючы інфармацыю пра свайго сваяка і — несумненна — героя, мы з сынам Паўлам вывучылі інфармацыю на сайтах «Подзвіг народа» і «Памяць народа», знайшлі нумар пасведчання ветэрана і назвы яго воінскіх часцей, наведалі Быхаўскі ваенкамат, дзе ўпэўніліся, што Іван Апанасавіч Рудкоўскі (там, праўда, прозвішча запісана як Руткоўскі) сапраўды нарадзіўся ў 1918-м, што скончыў ваяваць у званні капітана...

Распыталі мы і яго сваякоў. Ад цёткі Валянціны, роднай пляменніцы Івана Апанасавіча, даведаліся, што ў яго было тры сястры, дзве вышэйшыя адукацыі і сціпла ўся ў шрамах ад раненняў, што першая жонка Дуся памерла вельмі маладой ад цяжкай хваробы, што з другой у горадзе Орску Аранбургскай вобласці ён гадаваў сына Анатоля...

І гэтая пляменніца, і іншая радня згадваюць, што Іван Апанасавіч быў добрым, шчырым чалавекам — сапраўдным настаўнікам. Пахаваны ён на нашых Макранскіх могілках. Там жа некалі даўно яму пастаўлены сціплы помнік.

А яшчэ адным, як нам здаецца, можа служыць вёска, якую ён не спаліў, не знішчыў.

І можа служыць школа, у якой па-ранейшаму вучацца дзеці, а я працую настаўніцай.

**Алена Цывілька,**

*аг. Мокрае, Быхаўскі раён.*

Думаю так

# «НЕ ШУКАЙЦЕ ІДЭАЛЬНЫХ ЛЮДЗЕЙ, БО ТАКІХ ПРОСТА НЕ БЫВАЕ»

**Гэта заканамерна: з узростам, а тым больш ля парога ў лепшы свет, чалавек азіраецца назад, на пражытыя ім гады, глядзіць, што паспеў зрабіць (і правільна!), а што трэба было іначай.**
**Добра тым, хто цяпер за рулём: не ведаеш дарогі — уключай навігатар. А вось у жыцці...**
**Хто сарыентуе (асабліва маладых), хто падкажа, як калі паступіць, чым трэба даражыць і чаго трымацца?**

Я — чалавек немалады. На працягу пражытых гадоў мела многа знаёмых і сяброў (прычым самых розных прафесій-пасад), не раз адчувала падтрымку і перажывала здраду, заўсёды шмат чытала і думала... Штосьці з гэтай здабытай інфармацыі брала, як той казаў, на ўзбраенне, кіравалася ў жыцці і вось што зараз скажу. Пакуль птушка жывая, яна з'ядае мурашак, як толькі гіне, — мурашкі з'ядаюць яе. Так уладкавана жыццё. І нічога з гэтым не зробіш. Абставіны могуць змяніцца ў кожны момант... А таму не варта старацца некага перавыхаваць, змяніць, перарабіць на свой капыл, абясцэніць тое, што вас акружае.

Ну сапраўды: час нашага жыцця падобны да ракі. Бачыш яе і ведаеш, што ў адну і тую ж ваду нельга ўвайсці двойчы. Жыць трэба ў руху і спяшацца рабіць дабро. Іншага часу не будзе. Значыць, радуйцеся таму, што маеце, — кожнай хвіліне свайго жыцця, беражыце час і людзей, што побач, і, калі ласка, не шукайце знешняй прыгажосці ды ідэальных спадарожнікаў (бо іх, вось такіх, проста не бывае).

Так што няхай сярод вашых блізкіх і сяброў будуць тыя, хто паважае сябе, хто цэніць вас. Шануйце Бога і жыццё, даражыце сям'ёй і сябрамі...

Бога — таму што гэта наша сумленне. Жыццё — таму што яно кароткае. Сям'ю — таму што яна ўнікальная і толькі ваша, а сяброў — таму што яны сёння рэдкасць.

...Я жыву і думаю так. А калі гэтыя думкі стануць карыснымі для некага яшчэ, буду проста рада.

**Ніна Бурко,**

*Бярэзінскі раён.*

Як ёсць...

# УСЕ МЫ БУДЗЕМ СТАРЫМІ...

## Калі пашанцуе

**«І чаго гэтых пенсіянераў носіць? Чаму яны дома не сядзяць?!» — абураюцца часам людзі так званага працаздольнага ўзросту ў грамадскім транспарце, у крамах, чэргах...**
**Што казаць: многіх раздражняе чужая марудлівасць, буркатня, спроба звярнуць увагу... Але ж розныя бываюць людзі, розныя сітуацыі.**

...Гэтага пажылога мужчыну (гадоў васьмідзесяці) нельга было не заўважыць. Ён вельмі павольна хадзіў па краме і нешта сабе выбіраў, гэтак жа марудна падышоў да касы, пастаяў, павітаўся з касіркай і, што называецца, адважыў ёй камплімент, стаў павольна выкладваць з кошыка свае пакупкі, даставаць грошы...

А далей касір сама адлічыла патрэбную суму (у дзядулі моцна дрыжэлі рукі), падала яму чэк і рэшту. Іншая работніца крамы дапамагла пенсіянеру скласці ў пакет прадукты і правяла да выхаду, не забыўшыся пры гэтым нагадаць, каб не спяшаўся, каб ішоў асцярожна...

Усё гэта — што і казаць — заняло трохі лішняга часу, затрымала іншых пакупнікоў, але ж, дзякаваць богу, ніхто з нашай чаргі не стаў абурацца ды падганяць ні пажылога чалавека, ні касірку.

Чаму? Адказ, па-мойму, просты: усе мы (калі, вядома ж, пашчасціць) будзем старымі.

Гэта бясспрэчная ісціна. І ўсё ж кожны раз, калі становішся сведкай звычайнай чалавечай увагі і дабрыні, сэнс спасцігаеш па-новаму.

**Вольга Фядзяшына,**

*г. Слуцк.*

Дзейныя асобы

# «Многія цяпер адрываюцца ад сваіх каранёў...»

**Мікалай Іванавіч Быхаўцаў родам з Ваўкавыска. У 1970-м скончыў сярэднюю школу № 5, потым — Мінскі электратэхнікум сувязі, адслужыў у войску. Ён жа, завочна атрымаўшы вышэйшую адукацыю, каля 30 гадоў працаваў інжынерам кабельнай міжгародняй сувязі і за апошнія 20 апублікаваў каля 80 артыкулаў па гісторыі Ваўкавышчыны, выдаў 24 нумары ўласнага краязнаўчага часопіса.**

У пошуках звестак аб родным краі Мікалай Іванавіч аб'ездзіў архівы і музеі Мінска, Вільнюса, Санкт-Пецярбурга, Польшчы. Назвы яго кніг кажуць самі за сябе: «Паўстанне 1863—1864 гадоў у Ваўкавыскім павеце», «Гісторыя асветы на Ваўкавышчыне да 1915 года», «Першыя саветы», «На Ваўкавысцкім напрамку: 22—29 чэрвеня 1941 года»...

— Я даўно ўжо збіраю матэрыялы для гісторыка-геаграфічнага слоўніка Ваўкавыскага павета, — кажа Мікалай Іванавіч. — Чаму не раёна? Павет існаваў з 1507-га да 1940-га — больш за 400 гадоў! У слоўніку знойдуць месца гісторыі маёнткаў і фальваркаў, касцёлаў і цэркваў, спісы жыхароў кожнай вёскі ў розныя часы, карацей, усё, што пашчасціла знайсці ў архівах, бібліятэках, інтэрнэце і нават у прыватных размовах з людзьмі. Самыя раннія звесткі пра населеныя пункты Ваўкавышчыны захаваліся ў метрыках ВКЛ, якія перыядычна выдаюцца асобнымі кнігамі. Яшчэ адна крыніца інфармацыі — інвентары маёнткаў і старастваў, дзе падрабязна апісвалася іх маёмасць разам з прозвішчамі падуладных сялян. Кожны з населеных пунктаў у слоўніку будзе праілюстраваны і пазначаны дакладнымі геаграфічнымі каардынатамі.

Дзеля чаго ўсё гэта?

Па словах краязнаўцы, многія цяпер адрываюцца ад сваіх каранёў, не могуць назваць хоць бы пяць пакаленняў продкаў, не кажучы пра тое, каб ведаць, дзе яны пахаваныя. «Мне вельмі хацелася б прыцягнуць увагу да краязнаўчага руху, — кажа Мікалай Іванавіч, — зацікавіць інфармацыяй аб малой радзіме. Спадзяюся, што мая праца паспрыяе ў гэтым, стане своеасаблівым дапаможнікам, а некага, магчыма, і натхніць на стварэнне аналагічных слоўнікаў...?»



Працу над сваім слоўнікам Мікалай Быхаўцаў ужо завяршае. Праўда, пытанне з яго выданнем застаецца пакуль адкрытым.

**Сяргей Чыгрын,**

*г. Слонім.*

# НЕ ДЗЕЛЯ ВЫСЕЧКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яшчэ здалёк можна ўбачыць, як сярод вялікага поля плошчай 50 гектараў узводзіцца каркас будучага завода. Гэта сэрца прадпрыемства, кажа **дырэктар ААТ «ЭйчЭсБелакон» Вітаўтас СЛАНКАЎСКАС.** Ён падрабязна расказвае аб ходзе будоўлі. Маштабы немалыя. На пляцоўцы штодзень працуе некалькі дзясяткаў адзінак тэхнікі і каля 300 будаўнікоў. А пры пачатку мантажных работ колькасць рабочых павялічыцца ўдвая.

— Сюды прыехалі працаваць з Брэста, Мінска, Гродна. Усе яны жывуць у Свіслачы, таму зняць кватэру ў горадзе праблематычна, мабыць, у Мінску гэта прасцей. Мясцовыя жыхары з'язджаюць спецыяльна ў вёску, каб здаць гарадскую кватэру, бо цэны на іх зараз значна падняліся, — між іншым заўважае дырэктар.

Мяркуецца, што будаўніцтва завершыцца вясной наступнага года. Будаўнікі раз'едуцца, але на завод спатрэбяцца іншыя спецыялісты — па профілі прадпрыемства. Гэта ўжо будуць мясцовыя жыхары, якія пройдуць падрыхтоўку ў замежнікаў. Тыя спецыяльна прыедуць для гэтых мэт з Аўстрыі, бо само прадпрыемства — з аўстрыйскім капіталам.

Як расказаў прадстаўнік кампаніі, асноўным відам вытворчасці будзе габляваная дошка, а шчэпкі і апілкі пойдуць для вырабу пелетаў альбо на продаж іншым прадпрыемствам як сыравіна. Мяркуецца дасягнуць магутнасці перапрацоўкі ў 500 тысяч кубоў у год. Прадукцыя будзе прадавацца на міжнародным рынку, сувязі ў кампаніі наладжаны. Падлічаны і эканамічны эфект. Гадавая выручка складзе 60 мільёнаў еўра, гэта ў пяць разоў больш, чым увесь раённы бюджэт. У прадпрыемства ёсць усе шанцы стаць горадаўтваральным. Вядома, падаткі застануцца ў раёне.

Не магу не пацікавіцца, чым прыцягнуў увагу такога буйнога інвестара Свіслацкі раён.

— Не хвалюйцеся, пушчу ніхто пілаваць не будзе, — супакойвае кіраўнік завода. — Кампанія вельмі беражліва ставіцца да лясных рэсурсаў. Мы будзем перапрацоўваць толькі тую драўніну, якая аднаўляецца. Гэта значыць, сертыфікаваную па міжнародных і беларускіх стандартах.

Між тым выбар пляцоўкі для размяшчэння прадпрыемства невыпадковы. Трэба сказаць, што разглядаліся два варыянты — Лідскі і Свіслацкі раёны. Але бізнес-праект аказаўся на карысць апошняга. Чаму? Суразмоўца пералічвае відавочныя плюсы. У першую чаргу — блізкасць граніцы і наяўнасць вузкай («еўрапейскай») чыгуначнай каляіны, а таксама шыракай, звычайнай чыгункі. Важным фактарам з'яўляецца тэрыторыя СЭЗ «Гроднаінвест», якая забяспечвае на некаторы час падатковыя льготы. Ужо зарэгістравана мытная зона для фур.



Лагістычны тэрмінал у Свіслацкім раёне.

— Значную дапамогу аказваюць мясцовыя ўлады, з іх боку ёсць зацікаўленасць у тым, каб праект хутчэй запрацаваў, стваралася працоўныя месцы, — дадаў Вітаўтас Сланкаўскас.

Адкрыццё дрэваапрацоўчага завода забяспечыць работай 250 чалавек. Гэта нямала. Працоўныя месцы — значны плюс для раёна. Як патлумачылі ў Свіслацкім райвыканкаме, гэта стане стымулам для росту заработнай платы ў іншых сектарах эканомікі, у першую чаргу аграрным. Паколькі на заводзе ён стане значна вышэйшы, чым у сярэднім па раёне, улады будуць прыкладаць намаганні, каб і аграрны сектар не адставаў. Інакш пачнецца адток кадраў, што таксама недапушчальна.

Самі інвестары таксама бачаць перспектыву ў адкрыцці прадпрыемстваў на перыферыі і плануюць пасля пуску першай чаргі прыступіць да будаўніцтва другой. З увядзеннем усяго комплексу аб'ём прамысловай прадукцыі раёна ўзрасце з 11 да 80 працэнтаў. З такімі паказчыкамі можна гаварыць аб новым вектары ў эканоміцы рэгіёна.

Для таго каб прывабіць інвестараў, на тэрыторыі СЭЗ пачаўся мантаж новай электрападстанцыі на 63 МгВт, якую плануецца ўвесці ў 2023 годзе, бо пакуль энергарэсурсы абмежаваныя. Тады можна будзе гаварыць і пра новыя прадпрыемствы. У прыватнасці, яшчэ адной кропкай росту можа стаць стварэнне лесапільнай вытворчасці кампаніяй «Сільваў ЛаджыстыкБіУай». У СЭЗ ёю зарэзервавана 45 гектар пад будучую вытворчасць. Як толькі з'явіцца электрамагутнасці, яны ўключацца ў праект. Зараз прадпрыемства, якое працуе некалькі гадоў, займаецца транспартна-лагістычнымі паслугамі і захоўваннем прадукцыі. Тут перагружаюць драўнінна-габлюшкавыя пліты і перапрацоўваюць адходы піламатэрыялаў. У наяўнасці ёсць нават два ўласныя лакаматывы. Адсюль гатовая прадукцыя па вузкай каляіне адпраўляецца спажыўцам у еўрапейскія краіны. Па словах начальніка тэрмінала «Сільва Ладжыстык БіУай» Максіма Лучыца, аб'ёмы перагрузкі даволі значныя — 400 тысяч кубаметраў у год.

Працоўных месцаў не так многа — крыху больш за чатыры дзясяткі. Амаль усе работнікі мясцовыя, са Свіслацкага раёна. Магчыма, іх колькасць павялічыцца, бо магутнасці тэрмінала паступова нарошчваюцца з-за росту попыту на такія паслугі.

Вяртаючыся да размовы з дырэктарам прадпрыемства «ЭйчЭсБелакон», заўважаю, што літовец даволі добра валодае рускай мовай. І справа тут не ў мясцовых каранях. Аказваецца, Вітаўскас ужо восем гадоў жыве ў Беларусі. Яго кампанія адкрыла тут некалькі вытворчых аб'ектаў. Першы быў у Магілёве, другі — у Барысаве. У Свіслачы распачаты трэці праект.

— Мне тут вельмі падабаецца. Добра сябе адчуваю ў Беларусі і тут, у Свіслачы. Людзі працавітыя, ветлівыя і добрыя, — кажа на развітанне прадстаўнік інвесткампаніі. — Спадзяюся, што гэта не апошні наш праект.

Дарэчы, у райвыканкаме паведамілі, што цікавасць да раёна праяўляе і літоўская кампанія, і гэта прапанова разглядаецца. Тут не збіраюцца адмаўляцца ад выгадных інвестыцый.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**фота аўтара.**

---

Свет без межаў

# ШЫЦЬ, КАБ У ДРУЖБЕ ЖЫЦЬ!

***У Дзень народнага адзінства ў найстарэйшым беларускім горадзе Полацку падвялі вынікі творчых конкурсаў майстрых абрэзкавага шыцця, у тым ліку міжнароднага конкурсу, які праводзіўся на працягу пятнаццаці гадоў***



Творы будучай «Чырвонай кнігі».

## ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЯ КАМАНДА

Ініцыятар правядзення конкурсу «Свет без межаў» — нязменная кіраўніца найстарэйшага ў Беларусі народнага клуба аматараў абрэзкавага шыцця «Рошва» (азначае абярэгавае чырвонае шво), які працуе ў раённым Цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур. «Рошве» ўжо сямнаццаць гадоў.

— Праект быў задуманы і ў хуткім часе пачаты пятнаццаць гадоў таму падчас першага экалагічнага фестывалю, які адбыўся таксама ў Полацку, дарэчы, у верасні. Тэма экалогіі, чыстай прасторы, будучыні для нашых дзяцей і ўнукаў, пагадзіцеся, вечная. Яна хвалявала чалавецтва і будзе хваляваць, — распавядае Ніна Ярмух.

Яна і яе вучаніца Таццяна Захаранкава, таксама палачанка, у сваім творы «пасадзілі дрэва». Палічылі, што гэта імправізаваны сімвал зялёнай планеты. А прадоўжыла работу майстрыха з Вільнюса Алдона Таманітэ, якой перадалі пачатак будучага калектыўнага твора, — з пажаданнямі, каб дрэва расло моцным і цудоўным.

Потым сваю лепту ўнесла датчанка Элізабет Ёргенсан. За ёй — жыхарка расійскага Санкт-Пецярбурга Ніна Забеліна, кіраўніца клуба «Радова», якая дадала светлыя фарбы ў агульную палітру. Пасля яе да ўдзелу ў праекце далучыліся тры майстрыхі з нямецкага горада-пабраціма Полацка — Фрыдрыхсхафена: Эльфрыда Хіп, Хермінэ Штром і Вільтруд Фішэр, якія раней бралі ўдзел у праекце «Полацкі абярэг». За імі — Святлана Сямёнава з Латвіі.

— А завяршыла праект жыхарка французскай Ніцы Алена Бес'ер. Яна выбрала сіні колер — неба і мора, а яшчэ гэта колер мудрасці. Француженка ўпэўнена, што калектыўная мудрасць павінна дапамагчы нам не страціць адно аднаго падчас цяжкіх выпрабаванняў, — працягвае суразмоўца.

## У ПАДАРУНАК — ТКАНІНА

Такім чынам, можна ўбачыць насамрэч унікальнае палатно ад майстрых з сямі краін з «закадзіраванай» у тканіне інфармацыяй.

Дарэчы, у дзень, калі аб'явілі, што праект «Свет без межаў» фінішаваў, на цырымоніі прысутнічалі госці з Фрыдрыхсхафена. Яны з'яўляюцца актыўнымі ўдзельніцамі таварыства, якое ўжо дзясяткі гадоў падтрымлівае сяброўскія сувязі з палачанамі. У падарунак прывезлі матэрыялы для працы швачак, якія выраблюцца нямецкай фірмай, і інструменты.

Другой падзеяй стала аб'яўленне вынікаў творчага раўнду «Рамесная карусель», у якім бралі ўдзел і самі майстры, і дамы рамёстваў.

— У выніку сваю творчасць прадставілі 25 майстроў з 20 гарадоў! У кожным творы тое, што дарагое для тутэйшых і можа быць вельмі цікавым для турыстаў. Напрыклад, можна было адлюстраваць нейкую дэталь ці падзею з мінулага. Або проста настрой і стаўленне да пэўнага месца. Некаторыя аўтары нават пабывалі ў гасцях адно ў аднаго! — распавядае кіраўніца полацкіх майстрых.

## «ЧЫРВОНАЯ КНІГА» З КАВАЛАЧКАЎ

Аўтар гэтых радкоў стаў адным з нямногіх, каму паказалі яшчэ адну цікавінку. У свой час «Звязда» анансавала, што да саракавой гадавіны першага выдання беларускай «Чырвонай кнігі» «Рошва» пачала ствараць яе старонкі з абрэзкаў тканіны. І вось ужо можна ўбачыць некалькі дзясяткаў палотнаў з выявай рэдкіх раслін.



Сумесны твор — вынік працы майстрых з сямі краін.

— Мы плануем перадаць ужо сшытую кнігу ў падарунак полацкаму экалагічнаму музею. Думаю, і пасля гэтага будзем працягваць працу, бо ў «Чырвонай кнізе» вельмі шмат назваў раслін. Безумоўна, кожная з іх вартая, каб яе выяву зрабілі ў тканіне пяшчотныя жаночыя рукі, — працягвае Ніна Ярмух.

Яна ўпэўнена, што творчасць, як і прыгажосць, выратуе свет. І рамеснікі, народныя ўмельцы могуць спрыяць наладжванню міру, згладжванню праблем паміж народамі і дзяржавамі.

Дарэчы, паводле слоў Алесі Ступаковай, дырэктара Полацкага раённага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур, у наступным годзе ўстанове культуры споўніцца трыццаць гадоў.

Акрамя «Рошвы», тут працуюць гурткі па аплікацыі саломкай, ткацтве, кераміцы, абрэзкавым шыцці, народны клуб народных майстроў і мастакоў «Майстар», народны клуб майстроў «Роднасць», музычныя калектывы «Спадчына» і «Полацкія россыпы». Майстры — удзельнікі і дыпламанты раённых, абласных, рэспубліканскіх фестываляў і свят, у тым ліку міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», рэспубліканскай выстаўкі-кірмашу рамёстваў «Горад майстроў», абласнога конкурсу «Гуляй, гармонік», нацыянальнага свята «Дзень беларускага пісьменства», выстаўкі народнага мастацтва «Жывыя крыніцы» і іншых.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ,**
**фота аўтара.**

БЕЛ ВЭБ

**Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»**

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ОАО «Банк БелВЭБ» на 30 июня 2021 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | 30.06.2021 (неаудировано) | 31.12.2020 |
|---|---|---|
| **Активы** | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 719 005 | 836 947 |
| Драгоценные металлы | 5 | 21 |
| Финансовые активы, переоцениваемые по справедливой стоимости через прибыль или убыток | 4 664 | - |
| Средства в кредитных организациях | 46 712 | 53 957 |
| Производные финансовые активы | 4 576 | 32 |
| Кредиты клиентам | 3 193 476 | 3 543 672 |
| Инвестиционные ценные бумаги | 591 073 | 518 687 |
| Инвестиции в ассоциированные и совместно контролируемые компании | 915 | 2 546 |
| Основные средства | 56 190 | 53 599 |
| Активы в форме права пользования | 14 189 | 10 405 |
| Нематериальные активы | 42 352 | 40 520 |
| Текущие активы по налогу на прибыль | 962 | 436 |
| Прочие активы | 47 888 | 32 232 |
| **Итого активы** | **4 722 007** | **5 093 054** |
| **Обязательства** | | |
| Средства кредитных организаций | 1 313 799 | 1 408 298 |
| Задолженность перед Национальным банком Республики Беларусь | 20 763 | 26 |
| Производные финансовые обязательства | 990 | 7 860 |
| Средства клиентов | 2 322 999 | 2 600 298 |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | 67 866 | 78 457 |
| Обязательства по договорам аренды | 13 869 | 11 853 |
| Текущие обязательства по налогу на прибыль | 1 350 | 155 |
| Отложенные обязательства по налогу на прибыль | 28 185 | 16 918 |
| Прочие обязательства и резервы | 53 034 | 57 956 |
| Субординированные займы | 257 395 | 257 467 |
| **Итого обязательства** | **4 080 250** | **4 439 288** |
| **Капитал** | | |
| Уставный капитал | 473 057 | 473 057 |
| Эмиссионный доход | 458 | 458 |
| Дополнительный капитал | 5 485 | 5 485 |
| Фонд переоценки зданий | 2 467 | 2 479 |
| Фонд переоценки ценных бумаг | (72 777) | (2 732) |
| Нераспределенная прибыль | 233 067 | 175 019 |
| **Итого капитал, приходящийся на акционеров Банка** | **641 757** | **653 766** |
| **Итого капитал** | **641 757** | **653 766** |
| **Итого капитал и обязательства** | **4 722 007** | **5 093 054** |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ ИЛИ УБЫТКЕ ОАО «Банк БелВЭБ» за период, закончившийся 30 июня 2021 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | За 6 месяцев, закончившихся 30.06.2021 (неаудировано) | За 6 месяцев, закончившихся 30.06.2020 (неаудировано) |
|---|---|---|
| **Процентная выручка, рассчитанная с использованием эффективной процентной ставки** | | |
| Кредиты клиентам | 140 786 | 146 966 |
| Инвестиционные ценные бумаги | 13 841 | 16 808 |
| Средства в кредитных организациях | 757 | 2 942 |
| | **155 384** | **166 716** |
| **Прочая процентная выручка** | **1 733** | **-** |
| **Процентные расходы** | | |
| Средства кредитных организаций | (24 930) | (20 015) |
| Средства клиентов | (31 861) | (37 835) |
| Субординированный кредит | (7 814) | (6 909) |
| Процентные расходы по договорам аренды | (126) | (64) |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | (2 131) | (2 651) |
| | **(66 862)** | **(67 474)** |
| **Чистый процентный доход** | **90 255** | **99 242** |
| Создание резервов по кредитным убыткам | (35 434) | (40 783) |
| Чистые доходы/(расходы) от модификации кредитов | 642 | (2 173) |
| **Чистый процентный доход после создания резерва по кредитным убыткам** | **55 463** | **56 286** |
| Чистые (расходы)/доходы от первоначального признания финансовых инструментов, по которым начисляются проценты | (410) | 3 301 |
| Чистые комиссионные доходы | 37 135 | 39 338 |
| Чистые доходы по кредитам клиентам, оцениваемым по справедливой стоимости через прибыль или убыток | 442 | 1 570 |
| Чистые доходы по операциям с инвестиционными финансовыми активами, переоцениваемыми по справедливой стоимости через прочий совокупный доход | 23 | 476 |
| Чистые доходы/(расходы) по операциям в иностранной валюте: | | |
| - торговые операции | 15 212 | 18 143 |
| - операции с валютными производными финансовыми инструментами | 9 535 | (4 054) |
| - переоценка валютных статей | 4 604 | (22 835) |
| Доля в убытке ассоциированных и совместно контролируемых компаний | (1 631) | (65) |
| Восстановление/(создание) резервов по кредитным убыткам по прочим финансовым активам и условным обязательствам кредитного характера | 12 218 | (5 023) |
| Прочие доходы | 41 501 | 21 104 |
| **Непроцентные доходы** | **118 629** | **51 955** |
| Расходы на персонал | (42 665) | (32 136) |
| Амортизация | (14 192) | (9 850) |
| Налоги кроме налога на прибыль | (676) | (647) |
| Прочие операционные расходы | (42 372) | (49 174) |
| **Непроцентные расходы** | **(99 905)** | **(91 807)** |
| **Прибыль до расходов по налогу на прибыль** | **74 187** | **16 434** |
| Расходы по налогу на прибыль | (16 151) | (3 162) |
| **Прибыль за отчетный период** | **58 036** | **13 272** |
| Приходящиеся на: | | |
| акционеров Банка | 58 036 | 13 272 |

Председатель Правления банка В.С. Матюшевский

Главный бухгалтер – директор департамента бухгалтерского учета и налогообложения О.С. Турбина

25 августа 2021 г.

Бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на сайте www.belveb.by в разделе «Раскрытие информации/Годовая отчетность/Финансовые показатели/Отчетность/Отчетность в соответствии с требованиями МСФО/Квартальная финансовая отчетность за 2021 год».

*ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 21.12.2018 № 6. УНП 100010078.*

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 22 октября 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи: 1.** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортного средства (лот № 4) (автотехники и механизмов), а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3.** После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельного участка (лот № 1)**, необходимого для обслуживания предмета аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Продавца | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-38828** общей площадью **1 745,6 кв. м**, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **участок автодорог для обслуживания помещений ГПК** (составные части и принадлежности: Б – автодороги, въезды с бетонным покрытием, А – автодороги, въезды с асфальтобетонным покрытием, В – дорожки и площадки). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2, территория ОАО «Белфа». **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером 321850100001004545 общей площадью **0,4976 га** – для строительства и обслуживания домика дежурного с благоустройством (земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения). **Право аренды (доля в праве 307/1000)**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/25, участок № 2 | **88 560,00** | 8 856,00 |
| 2 | **Автоклав 3.2М2,** инв. № 142-42733 | **36 600,00** | 3 660,00 |
| 3 | **Автоклав 3.2М2,** инв. № 142-42734 | **36 600,00** | 3 660,00 |
| 4 | **Автомобиль ZAZ LANOS, 2010 г. в., рег. № 9533 ВТ-3**, цвет – темно-бордовый металлик, тип ТС – легковой седан, № кузова (рамы) Y6DTF69Y090224536, пробег – 221 637 км, состояние – на ходу | **6 000,00** | 600,00 |
| 5 | **Станок токарно-винторезный 1А616,** инв. № 142-41068, год выпуска – 1978 | **2 040,00** | 204,00 |
| 6 | **Станок поперечно-строгальный 7Е35,** инв. № 412-41122, год выпуска – 1977 | **2 400,00** | 240,00 |
